ЯК СЕЗОННЫЯ МАХЛЯРЫ ЗНАХОДЗЯЦЬ АХВЯР

5

100 ДЗЁН СТАРШЫНІ СЕЛЬСКАГА САВЕТА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

23 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 226 (28842)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта *(па выніках выязнога прыёму грамадзян у Мазыры):*

«Былі агучаны праблемы, якія мясцовыя ўлады маглі вырашыць на сваім узроўні, праявіўшы больш чалавечага падыходу да людзей. Гэта датычыцца не толькі аднаго канкрэтнага раёна. У прыватнасці, гэта тэмы газазабеспячэння, афармлення дакументаў на зямлю і нерухомасць у сельскай мясцовасці. Па такога роду пытаннях мясцовыя ўлады могуць знайсці магчымасць зрабіць крыху больш, чым прадпісана ў кагосьці ў функцыянальных абавязках, асабліва калі гэта датычыцца пенсіянераў, ветэранаў або інвалідаў».

КАРАТКА

- **Зборка турбаагрэгата пачалася ў машыннай зале другога энергаблока БелАЭС.**
- Адзіны тарыф на электрычную энергію для насельніцтва плануецца ўвесці ў Беларусі ў 2019 годзе.
- **Усе беларускія аптэкі падключацца да сістэмы электроннага рэцэпта да канца года.**

- Беларускія хакеісты не будуць лічыцца легіянерамі ў расійскіх клубах КХЛ.
- **Канцэрн «Белнафтахім» праводзіць апытанне насельніцтва для вызначэння далейшай стратэгіі змянення цэн на аўтамабільнае паліва.**

ЗЯЛЁНАЯ АСВЕТА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вучаніцы малодшых класаў Германавіцкай школы Шаркаўшчынскага раёна на занятках у экалагічным класе. Заняткі праводзіць грамадскі эколаг, настаўнік біялогіі і геаграфіі і кіраўнік школьнага экалагічнага клуба Марына ФЁДАРАВА.

Занятасць

«СТАЛОВАЯ Ў ВАС ЁСЦЬ?»

Як мінчане шукалі работу на кірмашы вакансій

«Нашы мужчыны едуць у Расію на заработкі, а потым плачуць, што ў працоўнай кніжцы запісу няма. А нам аддзелачнікі вельмі патрэбны!» — кажа кадравік мінскага будаўнічага прадпрыемства. Больш за 100 арганізацый сабраў учора ў сталіцы агульнагарадскі кірмаш вакансій. Каго шукалі наймальнікі і што чакаюць ад работы саіскальнікі — у нашым рэпартажы.

СТАР. 2

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сітуацыя

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Людміле 62. Яна жыве ў аднапакаёвай кватэры, якая афармлена ва ўласнасць не да канца. Тут даўно адключаныя электрычнасць і халодная вада. Каля трох гадоў яна не атрымлівае пенсію, бо згубіла пашпарт, сваякоў не мае. За камунальныя паслугі жанчына вінаватая каля трох тысяч рублёў... Гаспадыня сталічнага жылля, доўг якой блізіцца да 7000 рублёў, ужо два гады як памерла, а доўг застаўся. Кватэра ўвесь гэты час стаіць адамкнёная. Сваякі не спяшаюцца прымаць такую спадчыну, працягваючы жыць у інтэрнаце... Падобных гісторый у «камунальным» жыцці вялікага горада хапае. Але чамусьці злосныя неплацельшчыкі ўпэўненыя, што да крайняй меры — высялення з жылплошчы — ніхто прыбягаць не будзе. А дарэмна. У гэтым давялося пераканацца, прычыніўшыся да аднаго такога высялення ў Першамайскім раёне сталіцы. 46-гадовая Вольга жыла ў арэндным двухпакаёўцы, за якую завінавацілася дзяржаве амаль 4000 рублёў. Некалькі дзён таму яна пазбавілася сталічнай рэгістрацыі і фактычна апынулася на вуліцы.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

«СТАЛОВАЯ Ў ВАС ЁСЦЬ?»

Не ўмееце — навучым

Па назіраннях сталічнай службы занятасці, 70 працэнтаў беспрацоўных арыентаваны на рабочыя прафесіі. На кірмашы можна было знайсці шмат прыдатных прапаноў. Так, хлебазаводу № 2 патрабуюцца пекар, фармоўшчык цеста, укладчык. Заробкі — ад 500 да 700 рублёў. «Керамін» сваім супрацоўнікам гатовы плаціць больш — 800—900 рублёў. Па некаторых спецыяльнасцях — кантралёр-прыёмшчык вырабаў, апраўшчык-чысцільшчык — на заводзе можна прайсці навучанне.

— Яно цягнецца месяцпаўтара, — удаецца ў дэталі кадравік. — Аплата працы ў гэты час будзе, але, вядома, у меншым памеры — каля 300 рублёў. Адзіны мінус — гэтыя прафесіі цяжкія фізічна, бо звязаны з вытворчасцю вырабаў. Унітаз можа важыць 30 кілаграмаў!

Арганізаваць навучанне, калі трэба, гатова і прадпрыемства «Белмедпрэпараты». Напрыклад, па такіх спецыяльнасцях, як апаратчык стэрылізацыі, дазіроўшчык медыцынскіх прэпаратаў. Заробкі абяцаюць ад 480—560 рублёў.

Мінскі падшыпнікавы завод набірае кавалёў на молатах і прэсах (калі маеце чацвёрты-пяты разрад, будзеце атрымліваць ад 800 рублёў у месяц), токараў (на тыя ж грошы), шліфоўшчыкаў (ад 600 рублёў), фрэзероўшчыкаў (800—900 рублёў).

Ёсць прапановы і для некваліфікаванай працы. Бадай, самая папулярная вакансія — прыбіральшчык. Плацяць няшмат — ад 300 да 400 рублёў. У 12-ю гарадскую клінічную стаматалагічную паліклініку неабходны санітарка і дворнік.

— Вакансіі хутка закрываюцца, так што думайце, — кажа прадстаўнік медустановы мужчыну, які зацікавіўся прапановамі.

— А сталовая ў вас ёсць? — пытаецца той.

— Ёсць абсталяваны пакой прыёму ежы.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі ўзрост — перашкода

Кадраў не хапае ў гандлі. Так, гандлёвы дом «Палессе» шукае прадаўца, кантралёра-касіра, кухара, кандытара. Прапануюць 500—600 рублёў у залежнасці ад разраду. У гіпермаркетах Prostore гатовы плаціць на 100—200 рублёў больш. «Графік — два праз два, 12-гадзінная змена. Ёсць магчымасць падпрацоўкі для студэнтаў: аплата пагадзінная, час работы яны самі выбіраюць», — расказвае прадстаўнік сеткі.

У ЦУМе, акрамя прадаўца, неабходны кладаўшчык, грузчык і ахоўнік. Заробкі — каля 600 рублёў. З бонусаў — зніжка на абеды 30—40 працэнтаў у месцах грамадскага харчавання ўнівермага.

Адна з жанчын цікавіцца ў наймальнікаў вакансіямі бухгалтара.

— Я ездзіла ў Маскву, дапамагала дачцэ, толькі нядаўна ў Мінск вярнулася, — дзеліцца яна. — Па адукацыі я таваразнаўца, але вопыт бухгалтара ёсць. Пра заробак не думала — галоўнае, работу знайсці. Шмат адмоў атрымлівала. Мне 51 год, многія не хочуць браць з-за ўзросту — так адкрыта і кажуць. Хоць там, куды звярталася, дагэтуль бухгалтары патрабуюцца.

На кірмашы жанчына ўсё ж зацікавіла аднаго з работадаўцаў — яе запісалі на заўтра на гутарку.

Пра складанасці пошуку працы ў тых, каму «за», казала і іншая саіскальніца. Іне 52, мае дыплом інжынера-будаўніка. Праўда, па спецыяльнасці даўно не працавала, таму разглядае для сябе розныя варыянты. «Хацелася б, вядома, у офісе сядзець, але хто возьме? У аб'явах пішуць, што патрэбны кандыдаты да 40 гадоў... Тут знайшла для сябе вакансію прасавальшчыцы. Так, заробак невялікі — а што рабіць?» — уздыхае.

Шукаем тактоўных і ўраўнаважаных

Актыўна набірае працоўныя рукі сфера будаўніцтва. На «Мапідзе» адкрыта каля 50 вакансій — як тэхнічных, так і інжынерных. Прадпрыемства «КСП-92», якое займаецца адстройвальнымі работамі, запрашае маляроў, тынкоўшчыкаў, сталяроў, абліцоўшчыкаў.

— Робім кватэры пад ключ, усе аб'екты па Мінску. Заробак своечасовы, — падкрэслівае кадравік. — Рабочыя ў нас атрымліваюць ад 800 да 1500 рублёў у залежнасці ад кваліфікацыі. Заказы ёсць заўсёды.

Некаторыя саіскальнікі прыходзяць на кірмаш адразу з працоўнымі кніжкамі. «Дрэнныя артыкулы ў працоўнай ёсць? У міліцыі на ўліку былі?» — пытаюцца прадстаўнікі прадпрыемстваў, перш чым запісаць кандыдата на гутарку.

— У мяне спецыяльнасцяў шмат. Слесар-рамонтнік, наладчык абсталявання — цэлы спіс, — усміхаецца немалады мужчына.

Фармальна ён мае працу — на заводзе. Праўда, завод цяпер прастойвае. «Цэлы месяц наогул ніякай работы! — скардзіцца гараджанін. — Атрымліваю 6,60 рубля ў дзень. Вось і палічыце мой заробак».

На кірмашы мужчына спадзяецца падабраць вакансію, дзе плацяць 600—800 рублёў у месяц. І пажадана работу ў адну змену — узрост усё ж такі.

Кіроўцы неабходны ў аўтобусны парк № 7. Ахвотных папярэджваюць: умовы працы нялёгкія. Затое грошы добрыя: тым, хто ездзіць у горадзе, абяцаюць 1300 рублёў, на прыгарадных маршрутах — 1100. «Мінсктранс» запрашае кантралёраў. Сярэдні заробак — 680 рублёў. З патрабаванняў — агульная сярэдняя адукацыя, а таксама ветлівасць, тактоўнасць і ўраўнаважанасць.

Усяго ў сталіцы налічваецца больш за 17 тысяч вакансій. У большасці выпадкаў (57 працэнтаў) прапануюць ад 400 да 800 рублёў у месяц. Чвэрць свабодных рабочых месцаў з заробкамі да 400 рублёў. На кожнай шостай вакансіі гатовы плаціць ад 800 да 1500 рублёў, больш за 1500 рублёў — толькі ў 1 % прапаноў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота Ганна ЗАНКАВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У ЗША выпрабавалі новую ядзерную зброю

У ЗША прайшлі выпрабаванні новай мадэрнізаванай шматфункцыянальнай ядзернай бомбы B61-12, паведамляе выданне The National Interest. Выданне піша, што «B61-12 дазваляе наносіць розныя тыпы ўдараў: з пранікненнем у зямлю і над паверхняй, высокай і нізкай магутнасці, а таксама можа выкарыстоўвацца для разбурэння падземных бункераў». Дакладнасць удару павышана за кошт новага «хваставога апярэння, а таксама інерцыйных навігацыйных сістэм». Як паведамляе дырэктар інфармацыйнага праекта аб ядзерных узбраеннях Федэрацыі амерыканскіх навукоўцаў Ганс Крыстэнсен, B61-12 валодае функцыямі ядзерных бомбаў B61-7 (магутнасцю 10—360 кілатон), B61-11 (400 кілатон для наземных удараў) і B83-1 (выкарыстоўваецца для разбурэння падземных бункераў), але з меншай колькасцю радыеактыўных ападкаў і «больш эфектыўнай сістэмай паражэння».

Пенсійны ўзрост у Японіі плануюць падняць да 70 гадоў

Урад Японіі мае намер падняць планку пенсійнага ўзросту ў краіне да 70 гадоў замест цяперашніх 65 гадоў для працягу эканамічнага росту ва ўмовах хуткага «старэння» насельніцтва. Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва «Кіёда Цусін» са спасылкай на праект даклада спецыяльнай камісіі па гэтым пытанні. Па даных агенцтва, ідэі павелічэння пенсійнага ўзросту будуць разгледжаны 26 лістапада на пасяджэнні Савета па эканамічнай і фінансавай палітыцы, каб да наступнага лета падрыхтаваць канкрэтны план. Законапраект аб павелічэнні пенсійнага ўзросту мяркуецца падрыхтаваць у 2020 годзе, ён будзе ўлічваць розныя ўмовы працоўнай дзейнасці, напрыклад скарочаныя працоўныя дні, выкананне дыстанцыйнай працы з дому, выдзяленне субсідый кампаніям за наём пажылых супрацоўнікаў. Як вядома, сярэдняя працягласць жыцця ў Японіі складае ў мужчын звыш 80 гадоў, а ў жанчын — звыш 87. Паводле даных японскага ўрада, кожнаму чацвёртаму жыхару краіны больш за 65 гадоў.

Пад Антарктыдай знайшлі загадкавую зону

Міжнародная група навукоўцаў высветліла, што пад Усходняй Антарктыдай размяшчаецца крыніца геатэрмальнай энергіі, якая можа спрыяць раставанню ледавіковага шчыта. Пра гэта паведамляе выданне Science Alert. Вынікі радыёлакацыйнага зандзіравання, якое дазволіла выявіць працэсы пад трохкіламетровай тоўшчай лёду, паказваюць, што лёд у гэтай зоне плавіцца знізу ўгору, а адталая вада сцякае ў падлёднае возера. Працэс раставання можа працягвацца тысячы ці мільёны гадоў, і сам па сабе ён не ўплывае на знікненне ледзянога покрыва. Аднак у будучыні можа зрабіць рэгіён больш адчувальным да наступстваў глабальнага пацяплення. На думку спецыялістаў, найбольш магчымымі крыніцамі цяпла з'яўляюцца радыеактыўныя пароды і гарачая вада, якая вывяргаецца з глыбінь зямной кары.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13

Предмет аукциона (одним лотом)

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (номер дома)
Месторасположение предмета аукциона: Минская обл., Слуцкий р-н, **г. Слуцк**, ул. Максима Богдановича			
Здание кирпичное	40,4 кв. м	640/С-84557	д. 136А/1
Здание склада	286 кв. м	640/С-84559	д. 136А/2

Сведения о земельном участке: пл. 0,1009 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий. Ограничения прав: водоохранная зона реки Случь, площадь 0,1009 га

Начальная цена с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.10.2018

Дата и время проведения аукциона: 21.12.2018 в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 20.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Минскагротранс», г. Минск, ул. Бабушкина, 29, п/у Колядичи

Предмет аукциона

Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: Минская обл., г. Столбцы, ул. 17 Сентября, 59, в составе

Автомастерская (здание нежилое), инв. номер **622/С-5578**, общ. пл. **277,1** кв. м

Здание вспомогательное (здание специализированное иного назначения), инв. номер **622/С-36385**, общ. пл. **37,5** кв. м

Мастерская (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), инв. номер **622/С-5576**, общ. пл. **786,6** кв. м, в т. ч. кирпичный забор, асфальтобетонное покрытие

Контрольно-пропускной пункт (здание нежилое), инв. номер **622/С-5574**, общ. пл. **158,8** кв. м, в т. ч. смотровая яма, ворота металлические, ограждение металлическое

Пристройка кирпичная (здание специализированное иного назначения), инв. номер **622/С-36384**, общ. пл. **3,8** кв. м

Линия электропередачи (сооружение специализированное энергетики), инв. номер **622/С-46452**, протяженность **82,9** м

Туалет кирпичный (здание специализированное иного назначения), инв. номер **622/С-36386**, общ. пл. **2,4** кв. м

Водопровод (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер **622/С-46453**, протяженность **313,3** м

Сведения о земельном участке	Земельный участок, общ. 1,1000 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной организации г. Столбцы ул. 17 Сентября, 59
Начальная цена с НДС 20 %	227 156,10 белорусских рублей (снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2018

Дата и время проведения аукциона	**06.12.2018** в 14.00мин по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**04.12.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»
извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 5 декабря 2018 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

1) О досрочном прекращении закрытой подписки на акции дополнительного выпуска Общества.

2) Об утверждении результатов размещения дополнительного выпуска акций Общества.

3) Об утверждении решения о выпуске акций.

4) О внесении изменений и дополнений в Устав Общества и их утверждении.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35.

Начало работы собрания в 18.00.

Регистрация участников собрания с 17.00 до 17.45 в день проведения собрания. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 30 ноября 2018 г.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 23.11.2018, по месту нахождения Общества.

Орган, созывающий общее собрание: наблюдательный совет, основание созыва: протокол от 22.11.2018 № 11/2018.

Наблюдательный совет ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

УНП 100036332

Напярэдадні падзеі

ГІСТОРЫЯ НА ЛЁДЗЕ

Беларусь упершыню прыме чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні

З 21 па 27 студзеня на лёдзе «Мінск-Арэны» пройдзе 111-е першынство кантынента. Беларускія гледачы змогуць убачыць наймацнейшых фігурыстаў Еўропы, у тым ліку шасціразовага чэмпіёна кантынента ў адзіночным катанні Хаўера Фернандэса. На турніры традыцыйна будуць разыгрывацца медалі ў чатырох відах праграмы: мужчынскім адзіночным катанні, жаночым адзіночным катанні, парным катанні і танцах на лёдзе.

«Гэта падзея, якая ўвойдзе ў нашу гісторыю, бо гэта від спорту, які быў любімы як у СССР, так і ў эпоху нашай незалежнасці, — адзначае **намеснік міністра спорту і турызму краіны Аляксандр БАРАЎЛЯ.** — *Фігурнае катанне карыстаецца цікавасцю ў нашых грамадзян, гэтым спортам сёння займаюцца каля 1100 чалавек, але думаю, на самай справе гэтыя лічбы большыя. У нас ёсць трэнерскія кадры, інфраструктура, умовы для заняткаў фігурным катаннем, але ёсць, вядома, і праблемы».*

З мэтай вывучэння вопыту арганізацыі падобных чэмпіянатаў беларуская дэлегацыя нядаўна пабывала на этапе Кубка свету ў Маскве, дзе пераняла вопыт расійскіх калег. Аляксандр Барауля адзначыў, што перад беларусамі стаіць задача арганізаваць турнір на высокім узроўні. *«Ужо створаны аргкамітэт, вядзецца планавая работа, у нас ужо ёсць вялікі вопыт у правядзенні спаборніцтваў, але я вымушаны адзначыць, што ў фігурным катанні ёсць шэраг спецыфічных асаблівасцяў, дробязяў і тонкасцяў, якія вызначаюць поспех гэтага турніру».*

Акрамя таго, задача кіраўнікоў і трэнерскага штаба — належным чынам падрыхтаваць беларускіх фігурыстаў, каб гледачы маглі атрымаць асалоду ад выступлення нашых спартсменаў. Імёны фігурыстаў, якія прадставяць Беларусь на чэмпіянаце, дакладна пакуль не вядомыя. Прэтэндэнты на барацьбу ў танцах Ганна Кублікова і Юрый Гуліцкі зараз рыхтуюцца ў Маскве пад кіраўніцтвам вядомага спецыяліста Аляксандра Жуліна. Хутка яны будуць выступаць на міжнародных спаборніцтвах у Варшаве і Заграбе. Менавіта па выніках гэтых турніраў у кіраўнікоў будзе разуменне аб ступені гатоўнасці пары.

Прэтэндэнтамі на выступленне ў адзіночных спаборніцтвах сярод мужчын з'яўляюцца Аляксандр Лебедзеў і Якаў Зянько, хто з іх будзе прадстаўляць краіну на еўрапейскім першынстве, вырашыцца на чэмпіянаце Беларусі, які пройдзе 15—16 снежня. Вядома, запаветны пропуск атрымае пераможца.

У парным катанні справы ідуць куды горш, даслая беларуская пара Таццяна Данілава і Мікалай Камянчук год таму развіталіся з прафесійным спортам, новыя маладыя фігурысты пакуль па ўзросце не падыходзяць для выступлення на чэмпіянаце Еўропы, таму спаборніцтвы сярод спартыўных пар пройдуць без удзелу беларусаў.

У жаночым адзіночным катанні нашы спартсменкі цяпер знаходзяцца на стадыі набору прахаднога тэхнічнага бала, ад вынікаў іх выступленняў будзе залежаць, ці трапяць яны на дамашні чэмпіянат.

Адзначым, што турнір у Мінску наведае шэраг ганаровых і вядомых людзей у свеце спорту, сярод іх Таццяна Тарасава, Алена Чайкоўская, Наталля Бесцям'янава, Андрэй Букін і Аляксей Ягудзін.

Дарэчы, абанементы на чэмпіянат Еўропы ўжо паступілі ў продаж, іх кошт 200 рублёў. Па гэтым білеце заўзятары змогуць наведаць усе спаборніцтвы турніру і ў тым ліку гала-прадстаўленне. Неўзабаве ў продаж паступяць і адзінкавыя білеты, іх кошт будзе вар'іравацца ад 5 да 50 рублёў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Інавацыі ў адукацыі

ТОЛЬКІ ЛІЧБА!

У БДУ распрацаваны электронныя заліковыя кніжкі. Гэта новаўвядзенне было закладзена ў Стратэгію лічбавай трансфармацыі ўніверсітэта.

Новыя лічбавыя фарматы дакументаў дазваляюць эканоміць сродкі і аптымізаваць атэстацыйны працэс у БДУ. Дарэчы, толькі ў гэтым годзе за кошт укаранення новых студэнцкіх білетаў на аснове міжнародных банкаўскіх картак універсітэт сэканоміў каля 40 тысяч рублёў. У найбліжэйшы час планаванне работы выкладчыкаў, іх справаздачы аб выкананні вучэбных даручэнняў, журналы куратараў, іншыя дакументы будуць весціся толькі ў электронным выглядзе ў асабістых кабінетах выкладчыкаў на ўнутраным сайце БДУ.

У адрозненне ад традыцыйнай інфарматызацыі лічбавая трансфармацыя дазволіць мадэрнізаваць змест адукацыі і тэхналогій навучання, аптымізаваць асноўныя працэсы дзейнасці ўніверсітэта і яго структуру.

У БДУ ўжо распрацаваны камплект творчых заданняў па розных дысцыплінах, праведзена больш за 100 заняткаў па новых методыках эўрыстычнага, дыялогавага навучання, у тым ліку — у дыстанцыйнай форме. Больш за 500 выкладчыкаў прынялі ўдзел у анлайн-семінарах па гэтых методыках.

Мяркуецца пашырыць магчымасці для выбару студэнтамі дысцыплін і перайсці на індывідуальныя тэрміны вывучэння асобных курсаў. На лічбавых платформах у навучальны працэс будуць укараняцца сістэмы развіццёвага, эўрыстычнага, дыялогавага навучання, арыентаваныя на творчую самарэалізацыю студэнтаў, развіццё ў іх крытычнага мыслення і крэатыўных здольнасцяў, стварэнне ўласнага адукацыйнага прадукту. Рэалізацыя асноўных задач стратэгіі лічбавай трансфармацыі прадугледжвае ўкараненне анлайн-навучання, пашырэнне экспарту дыстанцыйных адукацыйных паслуг, мадэрнізацыю бізнес-працэсаў на аснове лічбавых беспаперовых тэхналогій.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Тэлефон пытанняў і адказаў

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць і ў гэтую суботу, 24 лістапада. У аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме на званкі будуць адказваць з 9.00 да 12.00:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАЦЕЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Што на дварэ?

СНЕГ, МОКРЫ СНЕГ, МЕСЦАМІ З ДАЖДЖОМ

У панядзелак уначы пры праясненнях мінус 12 градусаў, а днём да 2 цяпла

Гэтымі днямі ўмовы надвор'я ў краіне вызначае перыферыя скандынаўскага антыцыклону. Пераважае воблачнае без істотных ападкаў надвор'е з тэмпературным фонам, блізкім да сярэдніх шматгадовых значэнняў. А ў гэтыя выхадныя чакаюцца кароткачасовыя ападкі і днём да плюс 3 градусаў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У гэтыя выхадныя дні ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць малаактыўныя атмасферныя франты, якія рухаюцца да нас з боку Заходняй Еўропы. У суботу месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі (снег, мокры снег, днём па паўднёвым захадзе краіны з дажджом). У асобных раёнах чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 марозу, пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 11 градусаў, удзень будзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла. У нядзелю таксама месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па паўднёвым захадзе — з дажджом. У асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе ад нуля да мінус 7 градусаў, удзень — ад 3 марозу да 3 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е ў краіне будзе ў асноўным вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым усходзе краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — 1—8 марозу, па поўначы пры праясненнях паветра астудзіцца да мінус 9 — мінус 12 градусаў, удзень па краіне чакаецца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

«Дарожнікі накіруюць у вёску грэйдар»

З вёскі Долкінды Нясвіжскага раёна са скаргай на гарачую лінію нашай газеты патэлефанаваў яе жыхар Аляксандр Кандрацьевіч Гуліцкі. Сутнасць яго звароту датычылася дарогі.

— Гравійка, метраў на 500, уся ў ямінах, разбітая. Мне 80 гадоў, я інвалід другой групы, перасоўвацца ў такіх умовах вельмі цяжка. Да таго ж і аўтакраме не праехаць. Дарогай ніхто не займаецца. Падсыпалі б яе, загрэйдавалі! — эмацыянальна даводзіў нам заяўнік.

Яго словы мы перадалі намесніку старшыні Нясвіжскага райвыканкама Міхаілу Афанасіку, у чыёй кампетэнцыі знаходзіцца кантроль за вырашэннем вышэйагучанай праблемы. Суразмоўнік, папрасіўшы колькі часу на ўдакладненне сітуацыі, даволі аператыўна паведаміў рэдакцыі наступнае.

— Сапраўды, ёсць невялікая праблема ў Долкіндах, якую мы вырашым элементарна: дарожнікі пашлюць туды грэйдар. Асфальту ў вёсцы няма, там пясчана-гравійная дарога. Пасля нядаўніх дажджоў, вядома, яе крыху размыла, утварылася ямачнасць, — сказаў Міхаіл Вікенцьевіч.

Па словах намесніка старшыні райвыканкама, дарожная тэхніка на момант звароту вяскоўца па чарзе працавала ў іншых населеных пунктах — ва ўсе адначасова яе накіраваць немагчыма. У любым выпадку дайшла б чарга і да Долкіндаў.

— Ёсць тэхналагічныя карты ўтрымання дарог, — дадаў Міхаіл Афанасік. — Сродкі для гэтага выдзяляюцца ў залежнасці ад працягласці апошніх і нарматыўных тэрмінаў правядзення такіх работ.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ДЫЯЛОГ ДЛЯ ПАРТНЁРСТВА

У Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханеса Рау распачаўся XVI Мінскі форум. Тэма гэтага года: «Беларусь і ЕС — будучыня партнёрства: дыялог, развіццё, дыгіталізацыя».

Кожны год у беларускай сталіцы па запрашэнні арганізацыі «Нямецка-беларускае таварыства» збіраюцца палітыкі, грамадскія актывісты і эксперты з розных краін, каб абмеркаваць пытанні адносін паміж Беларуссю, Германіяй і Еўрасаюзам. Што датычыцца двухбаковага супрацоўніцтва, то **генеральны дырэктар Нямецка-беларускага таварыства Райнер ЛІНДНЕР** сказаў, яно выходзіць на новы ўзровень.

— Мы чакаем, што ў мерапрыемстве прыме ўдзел каля 320 гасцей з 20 краін. Гэта своеасаблівы рэкорд, — паведаміў ён.

На форуме таксама прагучаць тэмы, прысвечаныя перспектывам рэгіянальнага супрацоўніцтва ў Еўропе, асаблівасцям эканамічных рэформаў у Беларусі, а таксама магчымасці ўдзелу грамадзянскай супольнасці ў рэгіянальным развіцці Беларусі.

Ганна ЮНЧЫЦ.

ДНЯПРО ЗНОЎ ЗАРЫБІЛІ СЦЕРЛЯДДЗЮ

Федэральнае агенцтва па рыбалоўстве Расіі правяло чарговае зарыбленне трансгранічнага ўчастка Дняпра. У раку ў раёне Смаленска выпусцілі каля 3,5 тысячы асобін малявак сцерлядзі. Па запрашэнні расійскага боку на зарыбленні прысутнічаў начальнік Віцебскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

У жніўні 2016 года ў Дняпры адбылася масавая гібель рыбы з-за буйнога замору на тэрыторыі Смаленскай вобласці. Загінулая рыба некалькі дзён плыла ўніз па цячэнні. Каб аднавіць запасы Дняпра і ўзнавіць папуляцыю сцерлядзі, якая раней была аб'ектам промыслу на гэтай рацэ, спецыялісты прыродаахоўных ведамстваў Беларусі і Расіі дамовіліся рэгулярна праводзіць зарыбленне. За два наступныя гады ў раку ўсялілі амаль 32 тысячы асобін рознаўзроставых малявак сцерлядзі, больш за восем тысяч экзэмпляраў сяголеткаў шчупака і каля тысячы двухгадовых сазанаў.

У Беларусі сцерлядзь пакуль занесена ў Чырвоную кнігу, вылоўліваць яе забаронена, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

У ГОМЕЛІ ЖАНЧЫНА ЎВАЛІЛАСЯ Ў СКЛЕП

Паведамленне пра гэтае здарэнне ў прыватным жылым доме паступіла ў цэнтр аператыўнага кіравання ўдзень.

Сітуацыю ўскладняла тое, што ўваходныя дзверы ў жыллё былі зачынены знутры. З дома жанчына прасіла аб дапамозе. Высветлілася, што пенсіянерка аступілася і ўвалілася ў склеп, самастойна падняцца не можа.

Ратавальнікі знялі шкло з аконнага праёма і такім чынам трапілі ўнутр. У адкрытым склепе на глыбіні двух метраў знаходзілася гаспадыня дома. Па яе словах, яшчэ напярэдадні вечарам, спускаючыся ў склеп, яна падвярнула нагу і ўпала.

Работнікі МНС дасталі жанчыну і перадалі яе брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пацярпелую шпіталізавалі ў бальніцу.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З кватэранаймальніка — у бяздомныя

Вас высяляюць, акурат зараз

Палова дзясятай раніцы. Вольга дома з сяброўкай Таццянай. Стук у дзверы. Прыйшлі службовыя асобы. Гаспадыня ўпускае нас усіх у кватэру. У паветры моцны застаялы тытунёвы смурод. Жыллё недагледжанае і запушчанае, некалі пабеленая столь на кухні чорная, аднак дзверы-вокны цэлыя, нават букет хрызантэм у вазе... Заношаная бялізна на незасланых канапах і мяккія звяры-цацкі на стале. Магніцікі, прылепленыя да пліты, цацачны драўляны домік... Брудна, але не страшна.

Думаецца, жанчына не здзіўлена прыходам такой дэлегацыі, хоць намагаецца паказаць, што для яе гэта нечаканасць:

— Я нічога не ведала. Лісты ніякія не атрымлівала. У нас вунь нават скрыні паштовай няма, садралі са сцяны, гляньце.

— Такія паперы мы высылаем заказнымі пісьмамі, іх трэба забіраць з пошты. Сёння мы вас па законе высяляем. Неатрыманне карэспандэнцыі не вызваляе ад адказнасці, — тлумачыць ёй **Ксенія КАРШАК, судовы выканаўца аддзела прымусовага выканання (АПВ) Першамайскага раёна,** паказваючы судовае прадпісанне на высяленне.

— Дык мне на рукі ніхто не выдаваў ніякіх лістоў. Я ж павінна была за іх распісацца.

Гэтая заўвага Вольгі пацвярджае, што яна, як і многія даўжнікі, лічыць, што калі пошту не атрымліваць, то быццам бы нічога і не павінны, а дзяржава папалохае, але нічога не зробіць, абыдзецца ўсё як-небудзь. Пра тое, што аплачваць камунальныя паслугі трэба папярэдне, проста каб іх атрымаць, як гэта робіцца ў многіх краінах, а не праз месяц пасля іх спажывання, — як у нас, яны нават чуць нічога не хочуць.

Спачатку судовы выканаўца дае гаспадыні час да 21 лістапада, каб сабраць рэчы і вывезці іх з хаты, бо тое, што застанецца, ужо не будзе ёй належаць.

— Вы ўвогуле збіраецеся вывозіць рэчы?

— Я думаю, мяне не выселяць.

— Вас ужо высяляюць, вось акурат зараз.

— Дык а куды ёй ісці? — абураецца сяброўка Таццяна. — Гэта як бомж атрымліваецца? З якой ласкі?

Калі я пытаюся, ці не зможа яна даць часовы прытулак Вользе з рэчамі ў сябе, адказвае: «У мяне свая сям'я, і дзеці, і ўнукі».

— А калі я падам апеляцыю і дакажу, што не атрымлівала карэспандэнцыю?

— Судовае рашэнне ўступіла ў законную сілу і не падлягае абскарджанню. У вас быў на ўсё гэта час. Цяпер ідзіце ў юрыдычную кансультацыю і высвятляйце што да чаго, калі хочаце, аднак гэтае жыллё вы ўжо не вернеце, — кажа Ксенія Каршак.

Вольга сцвярджае, што з лета плаціць па 120—150 рублёў са свайго заробку. Сапраўды, з ліпеня яна ўладкавалася прыбіральшчыцай на завод па дагаворы падраду, увечары яшчэ ў кафэ падпрацоўвае пасудамыйкай. Аднак гэта здарылася ўжо пасля суда, куды яна не з'явілася, і які выдаў прадпісанне аб высяленні.

Пытанне, чаму жанчына працаздольнага ўзросту, якая мае рукі і ногі, не пайшла на работу раней, у гэтай сітуацыі, хутчэй, рытарычнае. Як і спроба даведацца, чаму яна не прыватызавала кватэру. Не хацела быць уласнікам? Няхай сабе. Аднак калі стала вядома, што акрамя камуналкі прыйдзецца плаціць яшчэ і за карыстанне жыллём, якое знаходзіцца не ва ўласнасці, можна было падумаць, што сумы павялічацца? І не трэба гаварыць, хто там тыя ўказы чытае — чуткамі свет поўніцца — усе ведалі пра тэрміны на прыватызацыю і наступствы падзялення жылля на прыватызаванае і камерцыйнае.

— Не стойце, збірайце рэчы, не затрымлівайце наш час. Інакш выйдзеце ў тым, што на вас надзета, — далучаецца да размовы толькі што падышоўшая **Дзіяна ХЛЯБІНСКАЯ, вядучы юрысконсульт сектара арганізацыйна-кадравай прававой работы прадпрыемства «Домэнергасэрвіс»** — уласніка кватэры даўжніка.

Усе спадзяванні на адтэрміноўку для Вольгі знікаюць, яна пачынае пакаваць рэчы.

Сабраць 30 гадоў жыцця за дзве гадзіны

Жанчына да апошняга не верыць, што гэта яе апошнія хвіліны ў кватэры, дзе яна пражыла 30 гадоў. У вачах адчай, слёзы, надзея... У мяне самой камяк у горле, хоць разумею, што ўгаворы, тлумачэнні і лісты да Вольгі прыходзілі не адзін год, перш чым сітуацыя дакацілася да апошняй кропкі. Яна не прыходзіла на сустрэчы з судовым выканаўцам, не з'явілася на суд. Проста не хацела нічога мяняць і не верыла, што яе сапраўды ўрэшце выселяць.

— Наконт пагашэння даўгоў з Вольгай неаднаразова размаўлялі супрацоўнікі міліцыі, РДЦ, тлумачылі і расказвалі, што яе чакае, і што ёй трэба зрабіць. Даўгі ў яе былі ўвесь час, а гэта не адзін год, і нават не дзесяць. Перыядычна яна нешта плаціла, аднак запазычанасць да канца так і не пагашалася, — кажа Марына Корбут, намеснік начальніка разлікова-даведачнага цэнтра (РДЦ) № 6 Першамайскага раёна. — Яна не працавала, на што існавала — невядома. Неяк прыйшлі з міліцыянерам да яе, а яна на лаўцы перад пад'ездам ляжыць нецвярозая. Забралі яе ў выцвярэзнік. А што з яе возьмеш?

— Я не разумею, што мне рабіць, — пачынае плакаць Вольга. — Дайце мне час да 21-га, можа, я знайду грошы на аплату.

— У вас быў час выправіць сітуацыю яшчэ да чэрвеньскага рашэння суда, на які вы не з'явіліся. Выканаўчае вядзенне ў дачыненні да вас распачата 12 верасня, і даўно выйшлі ўсе тэрміны на зборы. Усе лісты, якія мы вам дасылалі, назад вярнуліся, таму што вы іх не атрымлівалі, — не пагаджаецца судовы выканаўца.

Службовыя асобы прапануюць пазваніць сябрам, знаёмым, каб яны дапамаглі сабраць рэчы і вынесці іх. У кватэры няма нічога каштоўнага, што можна было б арыштаваць і рэалізаваць ва ўлік спагнання доўгу.

Жанчына ўсё ж пачынае збіраць дакументы, асабістыя рэчы. З секцыі дастае закаткі, кажа, у суседзяў іх рабіла, там жа і ежу гатавала, бо пліта электрычная і, зразумела, без святла, якое ўжо даўно адключана, не працуе.

Вольга пакуе бялізну, знімае са сцен фатаграфіі. З крэсла за ўсім моўчкі назірае 16-гадовы Джэк — сабака быццам разумее, што гэта яго апошняя магчымасць пабыць у цяпле. У каробкі складваецца мноства шкляных і крыштальных чарак, келіхаў, ваз — посуд, як мноства мастацкіх кніг, таксама сведчыць пра былы дабрабыт сям'і. Кнігі жанчына таксама збірае, гартае старонкі, успамінае нешта. Калі каробкі канчаюцца — проста загортвае рэчы ў дзяругі. У пад'ездзе пакрысе вырастае гара няхітрага скарбу.

Жанчына не абураецца, не крычыць. Проста хапае розныя рэчы, узважваючы, браць іх ці не. Час ад часу просіць дазволіць ёй выправіцца і пачынае плакаць. У паветры адчуванне адчаю і бязвыхаднасці, і нават думкі, што яна сама давяла сваё жыццё да такой кропкі, не дапамагаюць.

Слесар пачынае мяняць замок у дзвярах...

Таццяна звоніць яшчэ адной сяброўцы Вольгі, просіць прынесці сумкі, каб дапамагчы сабрацца. Тая прыходзіць з сабакам і адразу з парога:

— Так, я не разумею, што тут адбываецца? Яна ж плаціць штомесяц па меры магчымасці. За што? Ну, давайце, выкіньце яе на вуліцу!

— Усё робіцца па законе, — адказвае Ксенія Каршак.

Жанчына так разыходзіцца, што пачынае абражаць службовых асоб, пакуль ёй не нагадваюць, што выклічуць міліцыю.

Вядома, шкада, што так атрымалася, аднак, як бачна, рэальна дапамагчы грашыма Вользе ніхто з сяброў не спяшаўся. Верылі, што не бывае такога, каб чалавека на вуліцу выставілі за даўгі. Але ж калі здымаеш жыллё ў прыватнага гаспадара — або плаціш, або з'язджаеш, і ніхто ў гэтым не пярэчыць. Чаму ж у аналагічнай сітуацыі з уласнікам — дзяржавай — павінна быць інакш?

Не будзеш плаціць — адключым святло

У кватэры зробяць рамонт і выдзеляць жыллё тым, хто мае ў ім патрэбу. А даўгі застануцца за папярэднімі кватарантамі. Спрабаваць спагнаць запазычанасць можна яшчэ тры гады пасля гэтага. Да поўнага пагашэння або прыняцця рашэння, што гэта немагчыма.

На рабоце ў кафэ Вольгу сёння падменіць Марыя, яе суседка, якая разам з ёй падпрацоўвае пасудамыйкай:

— Так шкада. Хоць бы які пакойчык ёй далі. Я ж ёй казала, ідзі працуй, хоць за капейкі. Летам вунь назбірай ягад, здай ці закатак нарабі. Ну пойдуць табе насустрач з доўгам. Сяброў, гэтых выпівох, на парог не пускай!

— Пойдзем да мяне, — кажа Таццяна. — Куды табе дзецца...

Вольга з сяброўкамі стаіць каля пад'езда побач з клункамі з няхітрым хатнім скарбам, яшчэ больш рэчаў засталося на лесвіцы. Пакуль жанчыны вырашалі, да каго з іх цяпер ісці Вользе, Джэк намагаўся вярнуцца з холаду ў цёплую хату. Сабаку ў гэтай гісторыі, здаецца, не пашанцавала больш за ўсіх — наўрад ці ў яго ёсць сябры і сваякі, якія дадуць прытулак хоць бы на нейкі час. А для Вольгі іспыты таксама толькі пачынаюцца... І вінаваціць у гэтым, думаецца, няма каго, акрамя сябе.

— Нядаўна з камерцыйнага жылля, якое будавалі для прафесарска-выкладчыцкага складу, сям'ю дацэнта БДУ выселілі. У яго доўг быў за трохпакаёўку 3300 рублёў. На званкі ні ён, ні жонка не адказвалі, на нас рэагавалі агрэсіўна. Пасля спаганялі доўг па месцы працы, — успамінае Марына Корбут. — Тут ужо не спішаш нявыплаты на тое, што чалавек п'е. У гэтым жылым комплексе ў нас, дарэчы, шмат даўжнікоў. Не разлічылі магчымасці заробкаў людзей і платы за карыстанне памяшканнямі павышанага камфорту.

Калі чалавек не аплаціў камунальныя паслугі ў тэрмін, на наступны ж дзень, 26 чысла, ён атрымае па тэлефоне паведамленне пра гэта. З гэтага ж дня на камуналку налічваецца пеня за пратэрмінаваную запазычанасць: штодзень 0,3 % ад сумы доўгу.

— Магчыма, жыхары проста забыліся заплаціць ці не паспелі, захварэлі ці з'ехалі куды. Тады яны проста дзякуюць і аплачваюць. Часам, і самі прыходзяць, кажуць, што зарплату затрымалі, таму пазней аплацяць. Вядома, да такіх людзей мы ніякіх санкцый не прымяняем, — кажа прадстаўніца РДЦ. — Калі ж паслугі не аплачваюцца ўжо два месяцы, то мы рыхтуем спіс такіх даўжнікоў. А супрацоўнікі камунальных службаў уручаюць ім пад роспіс папярэджанне, што прыпыняць аказанне камунальных паслуг, дакладней — абслугоўванне электралічыльніка.

Пасля гэтага на аплату даецца пяць дзён. Калі аплаты няма — электрычнасць адключаць. Калі і гэта не падзейнічала — мерай уздзеяння становіцца выканаўчы надпіс. Гэты дакумент накіроўваюць па месцы працы даўжніка, у фонд сацыяльнай абароны (калі вінен пенсіянер) або ў аддзел прымусовага выканання. Калі натарыус не можа вынесці выканаўчы надпіс, звяртаюцца ў суд па пастанаўленне аб утрыманні, тлумачыць спецыяліст.

Калі жыхары абыходзяцца без святла, не працуюць, не атрымліваюць пенсію, не маюць маёмасці і працягваюць не плаціць камуналку, ім уручаецца папярэджанне аб высяленні за даўгі. Праз месяц пасля гэтага іх з камерцыйнага жылля можна высяляць. На практыцы з моманту атрымання выканаўчага надпісу да высялення з камерцыйнага (арэндnага) жылля можа прайсці да паўгода. Прыватызаваную маёмасць страціць цяжэй. У такім выпадку папярэджанне аб адчужэнні маёмасці ўручаецца гаспадарам пасля шасці месяцаў запазычанасці. На выплату даўгоў ім даецца год. Калі нічога не мяняецца, кватэра прадаецца з таргоў, а за грошы, якія засталіся пасля выплаты даўгоў, даўжнікам набываюць іншае жыллё.

У любым выпадку, калі ты апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, страціў работу, няма грошай плаціць цяпер, заўжды можна папрасіць дапамогі. Зрэшты, проста расказаць сваю сітуацыю і спытацца, што рабіць, а не чакаць, пакуль прыйдуць цябе высяляць.

— З гэтага года можна складаць графік пагашэння запазычанасцяў роўнымі часткамі з улікам камунальных плацяжоў, — дадае Марына Корбут. — Зыходзячы з сумы доўгу і фінансавых магчымасцяў чалавека, асноўны доўг можна падзяліць і сплачваць на працягу трох месяцаў, паўгода, года. Пеня будзе налічвацца, аднак у адносінах да чалавека не будзе весціся выканаўчая вытворчасць і ён не будзе лічыцца злосным неплацельшчыкам.

Ірына СІДАРОК.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У «ЧУЖОЙ ПАРАФІІ...»

Сёлета хіба ў канцы лета з'явілася магчымасць праехацца па родных мясцінах, па сваёй Бацькаўшчыне, хоць на некалькі хвілін ды зазірнуць у некалі мнагалюдныя, а зараз выміраючыя ці нават нежывыя вёсачкі, дзе жыла ці дажывае шматлікая радня: толькі ў дзеда з бабуляй было 12 дзяцей!

Такім чынам заехалі мы і да свякроўкі жончынай сястры, неспадзеўкі пагасцілі там.

А пачалося ўсё, як водзіцца, з драбязы, з агляду гаспадаркі, з гароду, у якім, нягледзячы на пустазелле, вельмі шмат што яшчэ расло. Гаспадыня, у прыватнасці, пахвалілася добрай палоскай ячменю.

— Некалі б зжала і вокам не міргнула, — уздыхнула яна, — а сёння аніякай сілы ўжо...

— Можна скасіць, — тут жа знайшліся мы.

— Ды каго тут дапросішся? Каго дзе знойдзеш?

— А не трэба — ні таго, ні другога, — падрадзіўся я. — Скашу, балазе і час ёсць, і сілы, і вопыт. У вёсцы ж вырас. З маленства араў (ручкі плуга — вышэй галавы былі!), баранаваў, касіў, вазіў... Працаваў і дома, і ў калгасе... Дык чаму б і не ўспомніць?

На падворку тут жа знайшлася каса, у цянёк, пад куст, што на мяжы, гаспадыня паставіла трохлітровік пахкага малака ад сваёй кароўкі. І справа пайшла — ажно засвістала, нягледзячы на тое, што дзянёк выдаўся яшчэ той: пакуль ячмень скасіў, слоік малака і выжлукціў.

А потым ужо разам паселі за стол. Як водзіцца, знайшлася чарачка, а да яе — свая бульбачка (толькі што з печы з хрумсткай скарыначкай), яечня са свінінкай, дамашняя, можна сказаць, пальцам піханая каўбаска... Смаката, карацей, невыказная!

Ад пуза наеўся. Трэба ж было і запіць. Наліў у кубак малака, адрэзаў лустачку батона, па звычцы шчодра «накрыў» яго маслам.

— А ў нас так не ядуць, — прамовіла гаспадыня і тут жа, пачырванеўшы, асеклася.

Мая рука з батонам павісла ў паветры, а жанчына тым часам вінавата растлумачыла, што амаль усё малачко здае дзяржаве, каб мець нейкую капейчыну, што масла дома ўжо даўно не б'е, бо для гэтага трэба было б збіраць смятану, здымаць вяршкі. А «знятае» малако, вядома ж, ніхто не прыме. І парсючку яго аддаваць шкада. А можа, і грэх... Так што масла ёй выгадней купіць, бо колькі ж яго трэба...

«Калі на батон не мазаць?» — падумаў я наўздагон і таксама пачырванеў перад гэтай мілай вяскоўкай...

А потым яшчэ і ўспомніў наша, крылатае: «Што ні хата, то свой комін» і «У чужую парафію са сваім звычаем не ходзяць». А я, бач...

Век жыві, век вучыся.

Іван А.,

г. Мінск.

ХІМІК

Быў час (а можа, ён і застаўся?), калі ў вёсках самай хадавой «валютай» лічылі гарэлку. Прычым не «Маскоўскую» ці «Сталічную», а так званую карчоўку, бо сяляне «ціснулі» яе і сапраўды па лясах, па карчах... Сыравіна для гэтага — бульба, жыта, буракі — была ва ўсіх, тэхналогія прыгатавання — адпрацаваная да дробязяў, канспірацыя — амаль ваенная: тыя ж мініброварі працавалі гадамі. Ды і як без гэтага, калі дровы ці сена прывезці трэба, гарод узараць — таксама, дах падладзіць, бульбу выбраць ды пасадзіць... Куды ні кінь, усюды клін, гэта значыць, гарэлка.

Шмат негатыву прыўнесла яна ў жыццё, шмат гора ў сем'і, але ж і смеху было таксама.

...Наш зямляк Васіль горкім п'яніцам тады не лічыўся, але ж выпіць быў не дурны. Таму яго жонка, Ганна, гарэлку ў хаце ніколі не трымала: хавала то на гарышчы, то ў пуні, то ў склепе...

Гаспадар, праўда, усюды знаходзіў (хоць, мо, і не адразу)...

Так што Гануля мела занятак: шукала ўсё новыя і новыя хованкі.

Дык вось неяк, пасля навальніцы, Васіль пацягнуўся на ўзмежак, каб накасіць бычку травы. Ішоў памалу, глыбокай разорай паміж бульбай ды градамі, і раптам сярод цыбулі ўбачыў велікаватае шкло. Нагнуўся — дно хрушчоўскай шклянкі. Думаў, што адбітае — акуратна адгроб зямлю... Не, аказалася, цэлая пасудзінка... Надзетая на рыльца графіна, а ўжо ён — укапаны ў градку. І... не пусты!

Васіль — святкаваў! У душы. Але ж пакуль прыгроб знаходку зямлёй і вярнуўся ў хату. Жонка гатавала сняданак і як заўжды спяшалася, таму ягонае пытанне, ці не пара ўжо шчыпаць цыбулю, прапусціла міма вушэй: маўляў, вялікая — шчыпай: навошта пытаешся?

Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBANBY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 07.12.2018 г. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Удача будзе спадарожнічаць вам шмат у чым. Некаторыя прадстаўнікі гэтага знака змогуць памяняць месца працы ці сустрэць сваё каханне. Вы адчуеце прыліў сіл і справіцеся з усімі справамі, за якія возьмецеся. Адзінае, ад чаго варта ўстрымацца, дык гэта ад удзелу ў новых праектах. Паспрабуйце прытрымлівацца старых, праверaных шляхоў.

ЦЯЛЕЦ. Старайцеся не марнаваць каштоўны час, на гэтым тыдні ён будзе на вагу золата. Усё задуманае можа здзейсніцца, калі вы спакойна і старанна будзеце рабіць сваю справу. Перш чым скласці план дзеянняў, варта праверыць надзейнасць тых, каму збіраецеся даверыцца. У другой палове тыдня можаце адчуць, што ў асабістым жыцці наспяваюць праблемы. Паспрабуйце пагаварыць шчыра. Пачуццё такту і спагаднасць дазволяць віртуозна справіцца з пастаўленымі задачамі.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень абяцае быць эмацыянальна насычаным і багатым на падзеі. Вы зможаце дамагчыся мэты, атрымаць прыбытак і здабыць каханне. Фартуна ўсміхнецца ў самы нечаканы момант, а гэта абяцае выкананне даўніх, ужо амаль забытых жаданняў. У чацвер вас чакае гарачае спатканне. У суботу зможаце добра павесяліцца на сяброўскай вечарынцы. Будзьце дабрэйшыя да сваіх блізкіх, пакажыце ім на справе, а не толькі на словах, як вы іх шануеце і любіце.

РАК. Тыдзень абяцае нямала прыемных падзей. Аднак ці хопіць у вас на ўсё гэта сіл? Больш адпачывайце, крыху раней кладзіцеся спаць. Магчымы кардынальныя перамены на рабоце, якія падымуць вас на новы прафесійны ўзровень. У сераду варта прызнаць свае памылкі, упартасць паставіць вас у значна больш няёмкае становішча. Нядзеля — удалы дзень, каб завесці хатнюю жывёлу.

ЛЕЎ. Нядрэнна было б навесці парадак і ў паперах, і ў галаве, і ў асабістых адносінах. Пажадана захоўваць эмацыянальную раўнавагу і не раздражняцца па дробязях. У аўторак будуць удалыя паездкі і камандзіроўкі, магчыма далёкае падарожжа, якое дазволіць атрымаць поспех у справах або будзе садзейнічаць умацаванню здароўя. У суботу варта схадзіць з сябрамі ў лазню ці хоць бы ў кіно.

ДЗЕВА. Панядзелак здзівіць непрадбачанымі паваротамі падзей, якія раскрыюць вашы найлепшыя якасці. У аўторак давядзецца экстранна вырашаць назапашаныя праблемы. Планамерна рухайцеся да мэты, тады яна стане дасягальнай. У пятніцу верагодныя перамены, да якіх вы псіхалагічна не падрыхтаваныя. Аднак панікаваць не варта, справіцеся. У суботу не трэба ператамляцца, адпачывайце, а не спрабуйце перарабіць усе хатнія справы разам.

ШАЛІ. На гэтым тыдні жаданне пазбавіцца ад цяжару адказнасці і збегчы ад праблем можа згуляць з вамі злы жарт. Не спяшайцеся завяршаць справы, якія, на вашу думку, ужо блізкія да фіналу. Раптам могуць выявіцца новыя абставіны, якія ў корані зменяць сітуацыю, і ўсё давядзецца перарабляць нанова. Многае будзе залежаць ад начальства і аб'ёму работ. У сярэдзіне тыдня абмяркуйце праблемы з сябрамі.

СКАРПІЁН. Тыдзень здабыцця ўнутранай раўнавагі і руху наперад. Не саромейцеся дэманстраваць свае таленты, адзін рашучы і ўпэўнены крок дазволіць дасягнуць мэты і адчуць у сабе магутны ўнутраны энергетычны стрыжань. Будзьце ўважлівыя да блізкіх людзей, у вас ёсць усе шанцы зрабіць адносіны ідэальнымі. Вашы ідэі будуць запатрабаваны ў прафесійнай сферы.

СТРАЛЕЦ. Можаце акунуцца ў кругаварот разнастайных дзелавых і асабістых праблем. Неабходна пераадолець сумненні і няўпэўненасць ва ўласных сілах. У панядзелак пастарайцеся праяўляць практычнасць у справах і размеранасць у жыцці, што прынясе поспех у найбліжэйшай будучыні. Цікавае знаёмства можа спрыяць прафесійнаму поспеху. Чацвер прынясе ўздым сіл, у гэты дзень атрымаецца многае паспець і адчуць задаволенасць ад вынікаў. Субота можа прайсці ў актыўных сяброўскіх зносінах.

КАЗЯРОГ. Тыдзень будзе накіраваны на павышэнне прафесійнага ўзроўню і раскрыццё творчага патэнцыялу. У аўторак чакайце ўзнагароджання за вашу настойлівасць і працавітасць. У пятніцу могуць узнікнуць акалічнасці, якія зменяць планы. У нядзелю сваякі нагадаюць пра сябе, паспрабуйце аказаць ім неабходную дапамогу і падтрымку.

ВАДАЛІЙ. Вас можа пацягнуць на авантурныя любоўныя прыгоды, толькі не страцьце галавы і не размаўляйце пра асабістыя справы са староннімі. Вас перапаўняюць новыя ідэі і планы, але ўвасобіць іх у рэальнае жыццё будзе няпроста. У сераду можаце прапусціць важныя, але на першы погляд нязначныя дэталі. Засяродзьцеся на рабоце.

РЫБЫ. Творчы настрой дазволіць здзівіць свежымі ідэямі сяброў і калег па рабоце. На гэтым тыдні вам больш чым калі-небудзь важна быць самім сабой. Незалежна ад меркавання навакольных неабходна абараніць сваю праўду. Не варта падладжвацца пад чужыя чаканні.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.51	17.00	8.09
Віцебск —	8.47	16.43	7.56
Магілёў —	8.41	16.50	8.09
Гомель —	8.31	16.54	8.23
Гродна —	9.05	17.17	8.12
Брэст —	8.59	17.24	8.25

Месяц

Першая квадра ***15 лістапада.***
Месяц у сузор'і ***Блізнят.***

Імяніны

Пр. *Вольгі, Ганны, Дзяніса, Івана, Канстанціна, Мікалая, Міхаіла, Пятра.*
К. *Маргарыты, Клеменса.*

Фота Андрэя САЗОНАВА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

23 ЛІСТАПАДА

У краіне

1893 год — нарадзіўся (вёска Наўіны, цяпер у Валожынскім раёне), Радзівон Канстанцінавіч Шукевіч-Траццякоў, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, журналіст. У 1919—1921 гадах у Чырвонай Арміі: баец, палітработнік, рэдактар газеты «Красноармейская правда». З 1922 года ў Галоўным упраўленні палітыка-асветніцкай работы, старшыня Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і мастацтва Наркамасветы БССР, сакратар Мінскага павятовага камітэта КП(б)Б. З 1924 года рэдактар газеты «Беларуская вёска». У 1931—1936-м супрацоўнік Інстытута філасофіі Беларускай акадэміі навук. У 1938 годзе арыштаваны, у 1940-м асуджаны да пяці гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у 1942-м. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

1923 год — створана першае беларускае літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». Паўстала з ініцыятывы маладых пісьменнікаў А. Александровіча, А. Бабарэкі, А. Вольнага, А. Дудара, Я. Пушчы, М. Чарота пры падтрымцы партыйных і камсамольскіх органаў, Камісарыята народнай асветы. Цэнтральнымі друкаванымі органамі былі часопіс «Маладняк», многія рэгіянальныя філіялы аддзялення мелі свае выданні. У 1924 годзе на стадыі фарміравання рэгіянальных філіялаў «Маладняк» стаў называцца Усебеларускім аб'яднаннем паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк». Меў шматлікія філіялы не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве, Ленінградзе, Рызе і Празе. У праграмных дакументах Цэнтральнае Бюро «Маладняка» прымала ідэалогію класавай барацьбы і пабудовы камуністычнага грамадства, абяцала прапагандысцкую падтрымку партыі і камсамолу, выступала за рэалізм у літаратуры, аднак з правам на выкарыстанне мастацкіх дасягненняў. У 1928 годзе рэарганізавана ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў.



1943 год — ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызвалены Брагінскі і Хойніцкі раёны.

У свеце

1898 год — нарадзіўся Радзівон Якаўлевіч Маліноўскі, савецкі военачальнік, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Першай сусветнай вайны, вайны ў Іспаніі (1936—1939). У Вялікую Айчынную ваяваў на Данскім, Варонежскім, Сталінградскім, Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, 3-м і 2-м Украінскіх франтах. Пасля вайны — камандуючы войскамі Далёкаўсходняй ваеннай акругі. У 1957—1967 гадах быў міністрам абароны СССР. Памёр у 1967 годзе.

1917 год — УЦВК і СНК прынялі дэкрэт «Аб знішчэнні саслоўяў і грамадзянскіх чыноў», якім скасоўваліся грамадзянскія, ваенныя і прыдворныя чыны, а таксама ордэны, медалі і іншыя знакі адрознення дарэвалюцыйнай Расіі.

УСМІХНЕМСЯ

— Як у вас з кар'ерным ростам?

— Усё ў парадку! Я прыйшла на працу паўгода таму простым прадаўцом, а цяпер я ўжо жонка генеральнага дырэктара!

— Якая розніца для паляўнічага паміж сабакам і лісіцай?

— Прыкладна дзве шклянкі гарэлкі.

У пяціпавярховіку падвал з бульбай затапіла кіпнем, і ад прастуды вылечыўся ўвесь дом.

— Дарагая, а ў цябе ёсць якая-небудзь эратычная фантазія?

— Ёсць.

— Раскажы.

— Я займаюся каханнем пад пальмамі на экзатычным востраве ў трапічную ноч. Побач шуміць мора, на небе велізарныя зоркі, пахне незнаёмымі травамі. Ад віна кружыцца галава...

— А я — я зверху ці знізу?

— А ты дома застаўся.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ПЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4173. Нумар падпісаны ў 19.30 22 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

23 лістапада 2018 г. № 47 (480)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Што гарантуе дзяржава замежным інвестарам?

Фота БелТА.

СМЕЛЫХ ПАДТРЫМАЮЦЬ

У горадзе Мёры Віцебскай вобласці будуецца металапракатны завод (ММПЗ). Праект рэалізуецца за кошт замежных інвестыцый. Ён стартаваў у 2012 годзе, у другой палове 2019-га вытворчасць будзе запушчана, што дазволіць стварыць самае меншае 600 рабочых месцаў. Аб'ём інвестыцый склаў каля 350 мільёнаў еўра. «На сённяшні дзень мы рэалізавалі 160 мільёнаў еўра выдаткаваных грошай, — расказаў старшыня савета дырэктараў ААТ «ММПЗ-груп» Аляксей КАВАЛЁНАК. — Праект рэалізуецца ў малым гарадку, па-за дадатковых спецыяльных зон, на падставе дэкрэтаў № 10, № 7 і, канешне, з дапамогай дзяржавы, якая забяспечыла ўсю інфраструктуру».

Кіраўнік кампаніі ўпэўнены, што запуск завода дазволіць Беларусі заняць адно з вядучых месцаў у металургіі па вытворчасці белай бляхі. Размова ідзе пра пакрытую волавам сталь, якая выкарыстоўваецца для вырабу ўпакоўкі ў харчовай (кансервавыя бляшанкі, ёмістасці для напояў) і хімічнай прамысловасці (аэразолі), нафтаперапрацоўцы. «Гэта тая ўпакоўка, якая адзіная адпавядае прынятым на Парыжскім саміце па абароне навакольнага асяроддзя нормам, згодна з якімі не менш за 80 % упакоўкі павінна вырабляцца з другаснай сыравіны», — пракаментаваў Аляксей Кавалёнак.

Топ-менеджар ММПЗ-груп упэўнены, што Мёрскі металапракатны завод стане лепшым у свеце па вытворчасці белай бляхі: «Сёння толькі адзін завод на планеце вырабляе белую бляху таўшчынёй 0,1 міліметра. Мы будзем другімі, але за кошт таго, што выкарыстаем усё самае сучаснае, мы станем найлепшымі».

Аляксей Кавалёнак лічыць, што ўмовы, створаныя ў нашай краіне для развіцця бізнесу, спрыяюць рэалізацыі падобных праектаў. Разам з тым, захады, якія былі зроблены з боку дзяржавы для ММПЗ праз спецыяльныя рашэнні, можна было б уключыць у законы. «Для людзей, якія прыходзяць з-за межаў Беларусі, будзе зразумела, што калі яны пажадаюць распачаць вытворчасць і яна вельмі патрэбная нашай краіне і рэнтабельная, то дзяржава забяспечыць усёй інфраструктурай», — растлумачыў старшыня савета дырэктараў ММПЗ-груп.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 3–14-й стар.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Укласці грошы ў Беларусь

Уся актуальная інфармацыя аб інвестыцыях у нашай краіне. стар. 4

На суботнік — праз заклік «УКантакце»

Што можа зрабіць за 100 дзён малады старшыня сельвыканкама. стар. 15

Замест кантэйнераў — машыны «адказных таварышаў»

На што скардзіліся жыхары Гаранскага сельсавета старшыні Мінскага раённага Савета дэпутатаў. стар. 16

стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9

Северный Кавказ — высок и близок

Международный экономический форум «Южные ворота России» прошел во Владикавказе

В нем приняли участие член Совета Республики Светлана Герасимович и депутаты Палаты представителей Национального собрания Беларуси Андрей Наумович, Валентин Милошевский и Ольга Петрашова. Все они являются членами Комиссии Парламентского Собрания Союза Беларуси и России по информационной политике.

sovrep.gov.by

Парламентарии встретились с представителями деловых кругов Беларуси, Армении и регионов Северного Кавказа. Вместе они ознакомились с основными направлениями развития бизнеса, обсудили перспективы развития межрегионального сотрудничества. На открытии форума с приветственной речью выступил председатель Комиссии Парламентского собрания по информационной политике Андрей Наумович. Он высоко оценил потенциал развития сотрудничества Беларуси и Северной Осетии. Участникам пленарного заседания депутат рассказал об основных достижениях Союзного государства, о динамике товарооборота Беларуси и России, назвал взаимодействие с регионами приоритетом в двустороннем сотрудничестве и призвал к наращиванию торговых отношений.

По окончании церемонии официального открытия форума состоялось подписание соглашения о сотрудничестве Торгово-промышленной палаты Республики Северная Осетия — Алания и Гродненского отделения Белорусской торгово-промышленной палаты. На следующий день прошло заседание Комиссии Парламентского собрания по информационной политике.

Образование под контролем

Сенатор провел прием граждан в Житковичах

На этой неделе состоялась рабочая поездка председателя Постоянной комиссии Совета Республики по образованию, науке, культуре и социальному развитию Виктора Сиренко в Гомельскую область.

Парламентарий принял участие в заседании сессии Житковичского районного Совета депутатов, на котором был рассмотрен ход выполнения регионального комплекса мероприятий по реализации Государственной программы «Образование. Молодежная политика» на 2016—2020 годы. В этот же день Виктор Сиренко провел прием граждан и прямую телефонную линию.

Поддержим молодежь

Власть в диалоге с вузами

Член Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по законодательству и государственному строительству, ректор учреждения образования «Витебский государственный ордена Дружбы народов медицинский университет» Анатолий Щастный принял участие во встрече руководства Витебского облисполкома с ректорами учреждений высшего образования Витебской области.

В ходе встречи обсуждались вопросы взаимодействия учреждений высшего образования с органами местной власти, социальной поддержки студентов, а также основные проблемы подготовки кадров в соответствии с региональными потребностями.

Надежда АНИСОВИЧ.

РАЗВИВАЯ ДИАЛОГ

В Беларуси будут работать эксперты Конгресса местных и региональных властей Совета Европы

Об этом заявил председатель Совета Республики Михаил Мясникович на встрече с директором структуры Жанном-Филиппом Бозулем. Группа специалистов будет реализовывать проект поддержки и развития местного самоуправления Беларуси.

Фото Евгения ПЕСЕЦКОГО.

Встречи сенаторов и представителей Конгресса местных и региональных властей Совета Европы стали регулярными.

— Когда выстраиваются системные отношения с Советом Европы, Конгрессом местных и региональных властей в частности, это говорит о том, что у нас действительно хорошие перспективы, — акцентировал внимание председатель Совета Республики Национального собрания Беларуси.

Напомним, круглый стол с участием специалистов конгресса состоялся в Минске в начале осени. По словам Михаила Мясниковича, он нашел продолжение в работе верхней палаты парламента с местными Советами депутатов и иными региональными структурами.

— Интерес нашей встречи заключается и в том, чтобы проинформировать нас, какова реакция соответствующих структур в Совете Европы на работу, которую мы проводим с Конгрессом местных и региональных властей. И безусловно, мы с господином Попковым (председателем Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению. — **Прим. ред.**) очень активно сейчас работаем над совершенствованием подходов по развитию местного самоуправления, — отметил спикер верхней палаты белорусского парламента.

Сферы, на которые при этом обращают особое внимание, — культура, образование, экология, занятость, миграция.

Беларуси интересен опыт Конгресса местных и региональных властей Совета Европы. Его наработки помогут активизировать деятельность и не допускать ошибок, которые уже преодолели другие страны в работе с местной властью.

Жан-Филипп Бозуль подтвердил мнение коллеги и отметил, что «постоянный контакт поможет выстроить действительно крепкие отношения».

❍ В ТЕМУ

В прошлый раз Михаил Мясникович и Жан-Филипп Бозуль встречались в конце апреля этого года. Визит позволил представителям структуры больше узнать о принципах самоуправления в Беларуси. Спикер верхней палаты белорусского парламента предложил коллегам чаще встречаться и обсуждать интересующие вопросы, чтобы избежать субъективности в оценках положения дел в нашей стране. Тогда была рассмотрена организация проведения в Минске международной конференции по вопросам местного самоуправления с участием представителей конгресса. Круглый стол, организованный Конгрессом местных и региональных властей Совета Европы и Советом Республики, состоялся в белорусской столице 11—12 сентября. Также председатель конгресса Гудрун Мослер-Тернстрем встретилась с Президентом Беларуси Александром Лукашенко.

❍ НАША СПРАВКА

Конгресс местных и региональных властей Совета Европы — консультативный орган, который представляет местные и региональные власти европейских государств. Он состоит из Палаты местных властей и Палаты регионов. Совет по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики Национального собрания Беларуси имеет статус приглашенного наблюдателя в Конгрессе местных и региональных властей.

— Также, я считаю, что семинар, который мы провели в сентябре, был успешен. Это отличное начало нашего нового сотрудничества, — подчеркнул директор Конгресса и отметил, что мероприятие также высоко оценила в своем докладе председатель структуры Гудрун Мослер-Тернстрем.

Первым шагом к укреплению сотрудничества станет подписание плана действий, который будет согласован с Советом Европы. По предварительной информации, это произойдет в начале следующего года.

По словам Жана-Филиппа Бозуля, конгресс выражает заинтересованность в политическом взаимодействии с нашей страной. Необходимо определиться со статусом, который Беларусь займет в конгрессе.

Кроме того, представитель организации предложил провести в будущем в Минске форум с участием уже нового руководства Конгресса местных и региональных властей Совета Европы.

Во встрече также приняли участие председатель Постоянной комиссии Совета Республики по международным делам и национальной безопасности Сергей Рахманов, а также секретарь комиссии по мониторингу конгресса местных и региональных властей Совета Европы Стефании Пуарель.

Мария ДАДАЛКО.

На повестке дня — жилищные вопросы

В Совете Республики прошло совещание на эту тему

В четверг, 22 ноября, под председательством главы Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания по региональной политике и местному самоуправлению Александра ПОПКОВА состоялось совещание, темой которого стало рассмотрение проекта закона «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам правового регулирования жилищных отношений».

В нем приняли участие заместитель председателя Постоянной комиссии Палаты представителей Национального собрания по жилищной политике и строительству Оксана Гайдук, заместитель министра жилищно-коммунального хозяйства Виталий Смирнов, специалисты министерств финансов, ЖКХ, архитектуры и строительства, по чрезвычайным ситуациям и других заинтересованных ведомств. Более подробно о предлагаемых новациях читайте в следующем номере «МС».

ЧТО МЫ УПУСКАЕМ?

Михаил Мясникович о том, почему усилия по привлечению инвестиций не всегда срабатывают

В 2016 году, выступая в парламенте, Президент Беларуси Александр Лукашенко поручил правительству и парламенту создать надлежащие комфортные условия для инвесторов, как отечественных, так и зарубежных, напомнил председатель Совета Республики Михаил МЯСНИКОВИЧ на парламентских слушаниях, посвященных теме привлечения средств в экономику Беларуси.

Фото пресс-службы Палаты представителей.

«Прошло достаточно много времени, созданы соответствующие рабочие группы, подгруппы, планы, стратегии, концепции, а каких-то прорывных решений и объемов в сфере инвестиционного цикла крайне недостаточно, — заметил спикер. — Были очень большие ожидания от ряда законов: «Об инвестиционных фондах», «О государственно-частном партнерстве», «О концессиях» и другие. К сожалению, серьезного влияния на инвестиционную деятельность эти нормативные правовые акты не оказали. Мы по-прежнему имеем низкие темпы роста инвестиций в основной капитал и прямых иностранных инвестиций».

Председатель Совета Республики озвучил несколько конкретных предложений для включения в рекомендации по итогам парламентских слушаний.

Спикер предложил, во-первых, законодательно закрепить институт специнвестконтрактов. Это обеспечит гарантию сбыта продукции на внутреннем рынке по ранее согласованным правилам, что снизит риск для инвестора в первые годы реализации проекта. Во-вторых, ввести стабилизационную оговорку, т. е. нераспространение на инвесторов, в том числе на совместные компании, действия нормативно-правовых актов, которые ухудшают условия работы по сравнению с теми, которые были на стадии заключения соответствующего инвестдоговора.

Еще одно направление — развитие правовых условий на рынке объектов интеллектуальной собственности. «Беларусь, как страна высокоинтеллектуальная, может на этом хорошо зарабатывать, — считает руководитель Совета Республики. — Есть поручение Президента: мотивировать инженерную мысль, управленцев не только за счет выплаты соответствующих роялти, но и в том числе через внедрение новых прогрессивных технологий — как на базисных отраслях, так и в новых проектах».

Михаил Мясникович с сожалением выразил мнение, что вопрос этот капитально провален. «В первую очередь Государственным комитетом по науке и технологиям, несмотря на ряд предложений. За последние годы количество заявок на патенты, на объекты промышленной собственности уменьшилось в разы, — констатировал он. — Человеческий потенциал, который мы имеем, надо мотивировать для того, чтобы он совершенствовал соответствующие технологические процессы и таким образом повышалась конкурентоспособность отечественной продукции. Полагаю, что это является и серьезным тормозом для инвесторов, которые хотели бы вкладывать инвестиции в науку или наукоемкие проекты, особенно стартапы, для того чтобы потом иметь экономическую выгоду».

Михаил Мясникович пояснил, что речь идет об исправлении практики, когда объекты интеллектуальной собственности, созданные в государственных организациях, являются собственностью государства: «Автора здесь нет. В этой ситуации, поскольку наука, образование да и базисные отрасли промышленности являются государственными, человек из процесса выключается. Суть моего предложения в том, чтобы при работе над соответствующим разделом Гражданского кодекса и отдельными законами об интеллектуальной собственности, в том числе авторских и смежных правах, этот пробел ликвидировать».

Далее председатель Совета Республики напомнил участникам слушаний и о глобальном проекте «Один пояс — один путь». «Мы упускаем время, если уже не упустили. Пекин планирует вложить в проект порядка 300 миллиардов долларов в течение ближайших 10 лет. Страны-партнеры и сами вкладывают очень большие средства в этот глобальный проект», — отметил он.

Речь идет о развитии не только международных грузовых перевозок, но и о больших проектах, которые должны сопровождать грузы из Китая в Европу и обратно. «Для нас, как страны транзитной, это крайне важно, — подчеркнул сенатор. — Сегодня в Беларуси этой темой занимается только Белорусская железная дорога. Остальные ждут, наверное, дополнительных поручений, в то время как казахи, узбеки, туркмены, турки, азербайджанцы, иранцы активно включаются. Через Казахстан разработано семь направлений движения грузов из Китая в Европу и обратно. Через Беларусь — только одно».

Михаил Мясникович обратил также внимание участников парламентских слушаний на слишком сложную процедуру отчуждения государственной собственности, в том числе на коммунальном уровне. «Очень много неэффективно используемых или неиспользуемых вообще производственных площадей акционерных обществ, — заметил он. — Это находится в управлении соответствующих предприятий. Целые цеха, корпуса пустуют. Руководство акционерных обществ ответственности за эффективное использование государственной собственности не несет, Госкомимущество тоже. Полагаю, что это неправильно. Государственная собственность должна приносить отдачу».

Председатель Совета Республики сослался на то, что огромное имущество находится в собственности государства, а приносит дивиденды только около трех процентов, причем основные средства поступают от «Беларуськалия» и Белорусской железной дороги, частично от авиации. «Полагаю, что по данному вопросу следует подготовить проект указа, предусматривающий, в том числе, сокращение сроков исковой давности по сделкам с государственным имуществом. Очень продолжительные сроки рождают сомнение у инвестора: не придут ли проверять через 3—5 лет. Неэффективных проверять не будут, а у эффективных могут спросить: почему ты купил по стоимости простенькой кофточки корпус, а потом стал получать на нем хорошую прибыль. Эти риски для инвесторов надо минимизировать», — считает сенатор.

Поручение Президента 2016 года надо выполнять не формально, а по существу, и улучшать условия для инвесторов, отметил в своей речи Михаил Мясникович.

Главная задача — формирование конкретного законодательства в широком смысле. И формирование доверия. Без первого и второго дело не сдвинется, резюмировал он.

Ольга МЕДВЕДЕВА.

МЕРКАВАННІ

Фота Вольгі МЯДЗВЕДЗЕВАЙ.

Кіраўнічы партнёр ААТ «Эрнст энд Янг» (беларускі офіс брытанскай аўдытарска-кансалтынгавай кампаніі) Павел ЛАШЧАНКА:

— Наш рэгіён, уключаючы Прыбалтыку, не вельмі цікавы для партфельных інвестараў з-за малых аб'ёмаў рынкаў капіталу, у прыватнасці ў Беларусі, нізкай ліквіднасці фондавага рынку і ўласцівых рызык. Гэтыя суадносіны малога аб'ёму і рызыкі ў тым ліку тлумачаць нядаўні правал IPO (першы публічны продаж акцый. — **«МС».**) групы «Еўрагандаль» у Лондане. Калі ўжо прыватная кампанія не змагла зрабіць IPO, то казаць пра тое, што дзяржаўная кампанія можа лёгка і хутка гэта зрабіць — няпраўда.

У маім разуменні сітуацыю трэба разглядаць літаральна як бойку за інвестыцыі. Нашы калегі па Еўразійскім эканамічным саюзе нас абагналі па многіх параметрах. Мэту ўвайсці ў трыццатку (у рэйтынгу Сусветнага банка «Вядзенне бізнесу». — **«МС».**) я чую 10 гадоў, калі не памыляюся. Мы, канешне, блізкія да мэты, але, калі мы ўвойдзем, гэта не значыць, што мы пераможам. Напрыклад, Кітай на 47-м месцы, і што?

Асабіста я лічу, што справа не столькі ў прававых умовах дзейнасці і асяроддзі, хоць, канешне, трэба над гэтым працаваць і трэба мець люстэрка — незалежных экспертаў, якія ацэньваюць намаганні ўрада і парламента.

Галоўнае — людзі. Яны ствараюць клімат і прыносяць плён. Людзі, якія працуюць з інвестарамі, павінны валодаць самае меншае трыма якасцямі, якія трэба разглядаць разам.

Першае, чалавек павінен быць патрыётам Беларусі: шанаваць дзяржаўны лад, умець працаваць у камандзе, інтарэсы краіны ставіць вышэй за свае і спавядаць эвалюцыйны шлях развіцця, а не рэвалюцыйны.

Па-другое, чалавек павінен быць пасіянарным, энергічным, прадпрымальным, ён павінен быць байцом на тым фронце, дзе змагаецца. Яму сказалі прыводзіць інвестыцыі — ён павінен з гэтым прачынацца і засынаць.

Трэцяя якасць — наяўнасць шырокага міжнароднага бізнес-кругагляду. Таму я глыбока перакананы, што людзі, якія адказваюць за інвестыцыі і працуюць у дзяржаўным сектары, абавязаны атрымліваць дадатковую адукацыю за мяжой. Гэта дазволіць істотна палепшыць веданне англійскай мовы, адпаведна — камунікацыю з патэнцыйным інвестарам, гэта дапаможа атрымаць асабістыя кантакты і потым са сваімі сакурснікамі рабіць бізнес у сваёй краіне, дапамагаць ім.

www.bel.biz

Кіраўнічы партнёр ААТ «Зубр Капітал» Алег ХУСАЕНАЎ:

— Я прадстаўляю прафесійных інвестараў. Мой бізнес дастаткова просты: хаджу па багатых кампаніях і людзях, міжнародных фінансавых інстытутах і ўгаворваю іх укласціся ў фонд, які будзе інвеставаць у прадпрыемствы Беларусі. Работа фонду складаецца менавіта такім чынам: мы збіраем грошы, інвестуем іх у мясцовыя кампаніі, праз нейкі час свой пакет акцый прадаём і вяртаем інвестыцыі ўжо з даходнасцю.

Зараз мы ў асноўным інвестуем у прыватныя кампаніі. У 1991 годзе, калі ўтварылася Рэспубліка Беларусь, усе кампаніі былі дзяржаўныя. У 2017 годзе доля прыватных кампаній у ВУП ужо склала больш за 30 %. Прытым у нашай краіне не было маштабнай прыватызацыі. Гэта тыя кампаніі, якія за кошт сваёй працы і свайго таленту стварылі частку эканомікі Беларусі. Падатковыя паступленні прыватнікаў ужо складаюць каля 75 %, што сведчыць пра больш эфектыўную іх працу ў параўнанні з дзяржаўнымі прадпрыемствамі.

У Беларусі склаўся ўнікальны ўклад, калі дзяржава і дзяржаўныя кампаніі выконваць пэўную сацыяльную місію, забяспечваюць людзей мінімальнай працоўнай занятасцю, разам з тым побач расце прыватны сектар, які стварае новыя працоўныя месцы. У нас ёсць перавага перад нашымі суседзямі, бо гэты ўклад даў пэўную стабільнасць у дзяржаве, а нішто так не прывабліве інвестараў як стабільнасць.

Акрамя таго, дзяржава ў нас стварае пункты росту: малыя гарады, Парк высокіх тэхналогій, Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

Рэкамендацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па выніках парламенцкіх слуханняў на тэму «Прававыя і практычныя аспекты паляпшэння інвестыцыйнага клімату ў Рэспубліцы Беларусь» уключаюць развіццё венчурнага інвеставання, пашырэнне асобных элементаў прэферэнцыяльных рэжымаў на ўсю тэрыторыю краіны або абласцей, планаванне інфраструктуры з улікам патрэб інвестараў, скарачэнне пераліку абавязковых умоў пры заключэнні інвестыцыйных дагавораў, павышэнне адказнасці дзяржаўных органаў за несвоечасовае выкананне абавязацельстваў перад інвестарам, забеспячэнне суразмернасці спагнання ступені віны і страты, якую прычыніў суб'ект гаспадарання.

Парламентарыі таксама рэкамендуюць профільным міністэрствам і ведамствам: працягваць работу над іміджам краіны, ліквідаваць папяровую цяганіну, гарманізаваць наша заканадаўства з заканадаўствам найбольш прывабных для інвестыцый краін, распрацаваць дакумент па ўрэгуляванні спрэчак паміж інвестарамі і дзяржавай, даць Нацыянальнаму агенцтву інвестыцый і прыватызацыі больш паўнамоцтваў, забяспечыць падрыхтоўку якасных кадраў у інвестыцыйнай дзейнасці, спрасціць працэдуру адводу і афармлення зямлі для інвестараў і іншыя меры, накіраваныя на ўзгодненасць нацыянальнага заканадаўства ў справе стварэння спрыяльных умоў для развіцця бізнесу.

УКЛАСЦІ Ў БЕЛАРУСЬ

Уся актуальная інфармацыя аб інвестыцыях у нашай краіне

На парламенцкіх слуханнях на тэму прававых і практычных аспектаў паляпшэння інвестыцыйнага клімату ў Беларусі сустрэліся не толькі дэпутаты і парламентарыі, кіраўнікі мясцовых і рэспубліканскіх органаў дзяржаўных кіравання, але і інвестары, эксперты, прадстаўнікі міжнародных арганізацый. Наш карэспандэнт паслухаў удзельнікаў і сабраў галоўнае з іх выступленняў.

Павінны стаць найлепшымі

Як адзначыў **першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН**, сёння ў нашай краіне створаны спрыяльныя ўмовы для інвеставання.

«Інвестар можа разлічваць на палітычную і сацыяльную стабільнасць, адсутнасць якіх-небудзь узрушэнняў. У сваю чаргу, Беларусь разглядае замежныя інвестыцыі як дадатковую крыніцу фінансавых рэсурсаў краіны для абнаўлення і пашырэння асноўнага капіталу, — сказаў першы віцэ-прэм'ер. — Інвестыцыйнае заканадаўства краіны пабудавана на сусветных прынцыпах. Яно гарантуе ўсе правы інвестарам, не падзяляючы іх на ўнутраных і знешніх».

Аляксандр Турчын нагадаў, што ў нашай краіне дзейнічае закон «Аб інвестыцыях», распрацаваны пры ўдзеле Міжнароднай фінансавай карпарацыі. Акрамя таго, было падпісана больш за 60 міжнародных пагадненняў аб заахвочванні і абароне інвестыцый. Беларусь — паўнапраўны член шматбаковага агенцтва па гарантаванні інвестыцый. Усё гэта абараняе інвестара і страхуе рызыкі па прынятых міжнародных стандартах.

Паводле яго слоў, практычна ўся тэрыторыя нашай краіны — гэта сукупнасць прэферэнцыйных рэжымаў, у межах якіх інвестарам даюцца падатковыя, мытныя льготы і іншыя перавагі для паспяховай рэалізацыі праектаў.

Першы віцэ-прэм'ер звярнуў увагу, што ўдасканаленне дзелавога і інвестыцыйнага клімату ў Беларусі праводзіцца на сістэмнай аснове. Ён расказаў, што нядаўна ўрадам была прынятая новая праграма дзейнасці да 2020 года. У ёй пытанне ўдасканалення інвестыцыйнага клімату замацавана ў якасці аднаго з прыярытэтаў эканамічнай палітыкі найбліжэйшага часу. «Пастаўлена амбіцыйная задача стварэння ў Беларусі найлепшых у ЕАЭС умоў для прыцягнення інвестыцый, вызначаны механізмы яе рашэння», — адзначыў ён.

Акрамя таго, вядзецца работа па карэкціроўцы закона «Аб інвестыцыях», што дасць магчымасць забяспечыць удасканаленне нормаў, якія датычацца гарантый абароны правоў інвестараў.

Яшчэ Аляксандр Турчын паведаміў, што цяпер сумесна з экспертамі Сусветнага банка ствараецца праект стратэгіі прыцягнення прамых замежных інвестыцый у краіну да 2025 года. У ёй вызначаюцца кірункі і меры па паляпшэнні інвестыцыйнага і дзелавога клімату, ажыццяўляецца ацэнка рэгулятарных і адміністрацыйных бар'ераў, якія перашкаджаюць прыцягненню інвестыцый.

Перабор з абаронай

Наступным на тэму павышэння інвестыцыйнай прывабнасці як найважнейшай умовы забеспячэння эфектыўнага эканамічнага росту ў Беларусі выступіў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый ВАРАНЕЦКІ**.

«Наша членства ў Еўразійскім эканамічным саюзе, бясспрэчна, найважнейшы фактар, які пазітыўна ўплывае на інвестыцыйную прывабнасць эканомікі Беларусі, — адзначыў дэпутат. — Разам з тым трэба прызнаць, што эканамічны саюз у рамках ЕАЭС пакуль не стаў рэальнасцю. Па сутнасці, тут няма не толькі ўласцівых любому эканамічнамусаюзу адзіных эканамічнай, прамысловай, сельскагаспадарчай, транспартнай, энергетычнай і іншых палітык, але і іх належнай каардынацыі».

Ён падкрэсліў: у выніку ўзнікаюць шматлікія бар'еры, канфіскацыі, абмежаванні. Акрамя таго, замежныя інвестары, якія вырабляюць высакаякасную прадукцыю ў Беларусі (фармальна на тэрыторыі Мытнага саюза), не заўсёды могуць свабодна прадаваць яе ў межах ЕАЭС. На думку Валерыя Варанецкага, гэта нонсэнс, які наносіць шкоду інвестыцыйнай прывабнасці як Беларусі, так і ўсяго саюза.

«Пакуль прадстаўнікі дзяржаў — членаў ЕАЭС у створаных інтэграцыйных структурах больш займаюцца пратэкцыянізмам уласных эканомік, чым думаюць пра інтарэсы і канкурэнтаздольнасць за ўвесь ЕАЭС, — заявіў дэпутат. — Калі не распачаць тут рашучых мер, гэты праект можа быць пастаўлены пад пагрозу».

Паводле яго слоў, з мэтай збалансаванага і ўстойлівага развіцця неабходна нарошчваць эканамічнае супрацоўніцтва не толькі з Расіяй, краінамі ЕАЭС, але і з ЗША, ЕС, іншымі эканомікамі свету, якія растуць. Для паляпшэння інвестыцыйнай прывабнасці нашай краіны трэба таксама працаваць над іміджам Беларусі за мяжой, упэўнены Валерый Варанецкі.

Якія перспектывы?

Аб задачах на будучыню расказаў **міністр эканомікі Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ**.

«Па выніках дзевяці месяцаў бягучага года мы бачым, што адзначаецца станоўчая дынаміка тэмпаў росту інвестыцый у цэлым па рэспубліцы. Тэмп — 109,8 %, пры гэтым ёсць апераджальны рост выдаткаў на набыццё машын, абсталявання, гэта значыць матэрыяльнай асновы нашай эканомікі, у тым ліку ў межах буйных інвестыцыйных праектаў, мадэрнізацыі нафтаперапрацоўчых заводаў, будаўніцтва АЭС, — адзначыў ён. — У структуры інвестыцый у рэальны сектар эканомікі 100 найбуйнейшых праектаў займаюць каля 40 %».

Акрамя таго, прыцягнута 1,4 мільярда долараў прамых замежных інвестыцый, гадавое заданне практычна выканана. Калі параўнаць з 2017 годам, то адбыўся прырост у 47 %. Цікава, што замежны капітал працягвае пераважаць у хутка акупных галінах беларускай эканомікі, у першую чаргу — у гандлі і сферы паслуг. Па словах міністра, стаіць задача паступова праводзіць пераарыентацыю і на прамысловы сектар.

Цяпер пра перспектывы:

«Да 2025 года мы плануем на першачарговыя інфраструктурныя праекты прыцягнуць каля 6 мільярдаў долараў, у тым ліку з выкарыстаннем механізму дзяржаўна-прыватнага партнёрства», — заявіў Дзмітрый Крутой.

А зараз — канкрэтныя задачы на будучыню. Яны даволі амбіцыйныя: увайсці ў топ-30 рэйтынга Doing Business, павялічыць да 2025 года аб'ём агульных інвестыцый у краіне да 53 мільярдаў рублёў, што складае рост практычна ў два разы да цяперашняга ўзроўню.

Як гэтага дасягнуць? У міністра эканомікі ёсць адказ і на гэтае пытанне. Так, неабходна завяршыць работу па карэкціроўцы заканадаўчай базы, упарадкаваць шэраг пастаноў урада, якія датычацца заключэння інвестыцыйных дагавораў, рэалізаваць «дарожную карту» зняцця бар'ераў і выключэнняў у ЕАЭС.

Таксама трэба спрашчаць працэдуры і скарачаць тэрміны атрымання ўсіх дазволаў, па магчымасці ў найбліжэйшай перспектыве стварыць поўную лічбавую аснову ажыццяўлення гэтых працэсаў з мэтай выключэння асобаснага і суб'ектыўнага фактараў чыноўнікаў любога ўзроўню для прыняцця рашэнняў.

«Важнай тэмай цяпер заняўся ўрад у частцы падрыхтоўкі інвестыцыйных пляцовак з гатовай транспартнай, інжынернай інфраструктурай», — адзначыў ён.

Міністр расказаў, што ў гэтай сферы была дасягнута пэўная мяжа, а прамога бюджэту ўжо не хапае, таму Прэзідэнт падтрымаў ініцыятыву ўрада і дазволіў прыцягваць крэдытныя рэсурсы на гэтыя кірункі.

Акрамя таго, у найбліжэйшы час плануецца поўнасцю перафарматаваць работу Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі. Прапановы практычна падрыхтаваны. Навошта трэба змяняць сістэму? Каб зрабіць гэты інстытут паўнавартасным «адным акном» для інвестараў.

Якія яшчэ праблемы?

Гэтую тэму ў сваім выступленні закрануў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ**. Ён адзначыў, што Беларусь імкнецца заняць лідарскія пазіцыі ў гэтай сферы, таму праблемы разгледзець неабходна.

Дэпутат звярнуў увагу на наступнае: калі ў 2010 годзе ўдзельная вага інвестыцый у ВУП складала 33,7 %, то пачынаючы з 2016 года інвестыцыі не перавышаюць 21 %. Што гэта значыць? Напрыклад, абсталяванне на прадпрыемствах у сучасных умовах мадэрнізацыі і рабатызацыі: тэрміны яго абнаўлення складаюць ад трох да дзесяці гадоў. Па словах Уладзіслава Шчэпава, аб'ём інвестыцый у 20 % — гэта крытычны ўзровень, які не дазваляе забяспечыць канкурэнтаздольнасць беларускай эканомікі.

Потым ён агучыў праблемы: першая — аб'ёмы прыцягнення інвестыцый. Другая — тэхналагічная структура інвестыцый: 48,9 % з іх — гэта будаўніча-мантажныя работы, папросту кажучы, грошы ўкладаюць у сцены, а не ў абсталяванне. «Сітуацыю трэба кардынальна змяняць», — канстатаваў старшыня камісіі па эканамічнай палітыцы.

Трэцяя праблема: больш за 60 % агульнага аб'ёму інвестыцый прыпадае на Мінск, Мінскую і Гродзенскую вобласці.

Аб свабодных эканамічных зонах

Міністр фінансаў Беларусі Максім ЕРМАЛОВІЧ звярнуў увагу прысутных на стымуляванне інвестыцый.

«У мэтах узмацнення стымулюючага складніка спецыяльнага рэжыму падаткаабкладання рэзідэнтаў СЭЗ да ўжо наяўных ільгот у праекце новай рэдакцыі Падатковага кодэкса дадаткова закладваюцца і новыя меры падатковага стымулявання, новыя льготы і прэферэнцыі, — расказаў ён. — Для ўдасканалення інвестыцыйнай дзейнасці ў СЭЗ без часовага абмежавання на ўвесь перыяд іх функцыянавання да 31 снежня 2049 года прадугледжваецца вызваленне ад падатку на прыбытак у частцы атрыманага рэзідэнтамі СЭЗ прыбытку ад рэалізацыі тавараў уласнай вытворчасці».

Дарэчы, на сённяшні дзень падатковая нагрузка для рэзідэнтаў СЭЗ складае 3,9 %.

Міністр фінансаў таксама нагадаў прысутным пра рашэнне Аляксандра Лукашэнкі аб пашырэнні межаў СЭЗ. Навошта? Гэта дазволіць размясціць рэзідэнтаў з улікам перспектыў іх развіцця, арганізаваць новыя рабочыя месцы, аптымальна задзейнічаць свабодныя зямельныя ўчасткі.

«Ёсць таксама і патрэба ў дадатковым развіцці інжынернай і транспартнай інфраструктуры СЭЗ, — адзначыў Максім Ермаловіч. — Гэтыя інвестыцыі, якія мяркуецца прыцягнуць у міжнародных фінансавых інстытутаў, дазволяць давесці аб'ём агульных інвестыцый у свабодныя эканамічныя зоны да 1 мільярда долараў».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Фотаздымкі прадастаўлены прэс-службай Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Тэлесеткі

СУЗОР'Е НА «МІНСК-АРЭНЕ»

У гэтыя выхадныя зоркі будуць ззяць асабліва ярка і не толькі на небе, у адпаведнасці з дэвізам дзіцячага «Еўрабачання-2018» — Light Up! Запальвай! У рэкордным спісе ўдзельнікаў з 20 краін — 2 дэбютанты, Казахстан і Уэльс, і некалькі вяртанняў: Францыя, якая не ўдзельнічала ў шоу з 2005 года, Азербайджан (прапускаў тры гады) і Ізраіль (прапускаў 2013—2015 і 2017 гады).

Юныя артысты ўжо правялі індывідуальныя рэпетыцыі, запісалі агульную песню — афіцыйны гімн конкурсу, наведалі знакавыя мясціны беларускай сталіцы і, канешне, пазнаёміліся і пасябравалі ў «Еўрадоме». Цяпер справа за малым: на генеральным прагоне і фінальным канцэрце 24 і 25 лістапада выйсці і паказаць сябе з найлепшага боку.

Звярніце ўвагу: у адрозненне ад дарослага шоу, дзіцячае пачынаецца ў «дзіцячы» час, а 18-й гадзіне, і будзе доўжыцца ўсяго 2,5 гадзіны. Каментаваць фінальны канцэрт на «Мінск-Арэне» ў прамым эфіры будуць тэлевядучыя Георгій Калдун і Андрэй Макаёнак. Радыётрансляцыю цырымоніі з каментарыямі Вікторыі Урбановіч і Паўла Лазовіка правядзе Першы канал Беларускага радыё, анлайн трансляцыя — на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by ці на афіцыйным сайце конкурсу junioreurovision.tv.

Акрамя таго, з сённяшняга дня можна прымаць удзел у глядацкім галасаванні на сайце junioreurovision.tv. Можна выбраць ад трох да пяці ўпадабаных выканаўцаў — прычым гэта можа быць і прадстаўнік Беларусі! Першы этап галасавання закрыецца 25 лістапада перад пачаткам шоу, а стартуе наноў пасля фінальнага канцэрта і толькі на 15 хвілін. Вынікі галасавання гледачоў будуць прыплюсаваныя да балаў нацыянальнага журы кожнай краіны — удзельніцы шоу, і пераможца дзіцячага «Еўрабачання-2018» вызначыцца па суме балаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 76

З 27 кастрычніка да 4 лістапада ў Гомелі адбыўся маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-100. Спаборніцтвы праводзіліся асобна сярод юнакоў і дзяўчат у чатырох узроставых групах па дзвюх праграмах — класічная гульня і бліц.

У класічнай праграме чэмпіёнамі свету сталі Міхаіл Семянюк, Вікторыя Нікалаева і Любоў Кобрына.

Бронзавыя ўзнагароды ў Яны Лазовік і Анастасіі Сакаловай.

Беларусь вылучаецца сярод іншых пераходных эканомік тым, што пазбегла рэформаў накшталт «шокавай тэрапіі», звярнуў увагу Аляксандр Піваварскі. Разам з тым эксперт прызнаў, што за апошнія 15–20 гадоў у краіне адбылося арганічнае развіццё прыватнага сектара. Зараз самы буйны работадаўца ў краіне — прыватныя кампаніі. Пра наяўнасць умоў для росту прыватнага сектара сведчаць і выпадкі пераходу малых і сярэдніх кампаній у катэгорыю буйных. Праз зліцці і паглынанні ў краіну ўваходзяць міжнародныя кампаніі. Некаторыя прадпрыемствы пачынаюць размяшчаць свае каштоўныя паперы на міжнародных рынках.

«Вельмі важна, што ў Беларусі рэпутацыя краіны з нізкім узроўнем карупцыі», — падкрэсліў Аляксандр Піваварскі.

Жаданне ўрада садзейнічаць развіццю прыватнага сектара мае вялікае значэнне, але гэтага мала, лічыць прадстаўнік міжнароднай фінансавай арганізацыі. У краіне трэба ствараць больш добразычлівыя ўмовы для бізнесу. У прыватнасці, неабходна дабівацца роўных умоў дзейнасці для прыватных інвестараў і дзяржаўных прадпрыемстваў. Неабходны роўны доступ да фінансаў. Інвестары павінны адчуваць, што іх правы будуць абароненыя ў канфліктных сітуацыях. «І важна, каб пакаранне ў адносінах інвестараў адпавядала цяжкасці іх правапарушэння», — дадаў Аляксандр Піваварскі.

Другі кірунак, дзе можна дабіцца значнага эфекту, — кіраванне дзяржаўнай уласнасцю. У гэтай сферы ЕБРР узаемадзейнічае разам з іншымі міжнароднымі арганізацыямі і беларускім урадам. «Ідэя ў тым, каб арганізаваць кіраванне дзяржаўнымі прадпрыемствамі гэтак жа якасна, як яно арганізавана ў самых лепшых прыватных кампаніях, — растлумачыў прадстаўнік ЕБРР. — Ставіцца да іх, як да кампаній, якія каціруюцца на міжнародных біржах».

www.ipr.by

Аляксандр ПІВАВАРСКІ *(злева)*, кіраўнік прадстаўніцтва ЕБРР у Беларусі, і Андрэй БРЫШЦЕЛЕЎ, старшыня праўлення ААТ «Белінвестбанк».

Два буйныя пілотныя праекты ў гэтым кірунку — Белінвестбанк і «Белаўтадар». У першым выпадку была зменена сістэма карпарацыйнага кіравання ў рамках перадпрыватызацыйнай падтрымкі. «Вынік ужо бачны — банк нарошчвае прыбытак», — паведаміў дакладчык на парламенцкіх слуханнях. Дасягненні «Белаўтадара» ў перспектыве могуць трансляваць на іншыя дзяржаўныя прадпрыемствы, мяркуе Аляксандр Піваварскі.

«Наша мэта — паказаць, што карпарацыйнае кіраванне сапраўды дае вынік і дазваляе трансфармаваць дзяржаўныя кампаніі такім чынам, каб яны не чакалі дапамогі ад дзяржавы, а самі дапамагалі ёй, — падкрэсліў выступоўца. — Мы разлічваем стварыць прыклады, якія можна будзе тыражаваць на буйныя беларускія прадпрыемствы, і лічым, што змяніць філасофію кіравання на 20–30 такіх прадпрыемствах на працягу двух-трох гадоў цалкам магчыма».

Паралельна з рэформамі дзяржсектара ЕБРР прапануе павысіць намаганні па прыцягненні якасных прыватных інвестараў на дзяржпрадпрыемствы.

Досыць перспектыўным эксперты банка лічаць і прыцягненне прыватных інвестараў да фінансавання інфраструктуры Беларусі. ЕБРР разам з урадам і міжнароднымі партнёрамі плануе знайсці сродкі на рэканструкцыю дарогі М-10. «У падобнага роду праектах замежны інвестар здымае з бюджэту частку абавязацельстваў, бо бярэ на сябе выдаткі па ўтрыманні аб'екта інфраструктуры на дзесяцігоддзі», — звярнуў увагу кіраўнік мінскага офіса ЕБРР.

Сярод мер, якія могуць палепшыць інвестыцыйную прывабнасць краіны, эксперты ЕБРР назвалі таксама папулярызацыю бізнесу і ўцягванне насельніцтва ў заняцце прадпрымальніцтвам, аслабленне ў гэтай сферы дзяржаўнага рэгулявання і кантролю, падтрымку малога і сярэдняга бізнесу ў вытворчасці.

Вельмі важныя таксама павышэнне фінансавай стабільнасці і развіццё нацыянальнага фінансавага рынку, у прыватнасці стварэнне ўмоў для рашэння праблемных крэдытаў, нарошчванне выпуску суверэнных фінансавых інструментаў у нацыянальнай валюце, камерцыялізацыя і павышэнне эфектыўнасці банкаў з дзяржаўнай формай уласнасці і рэгуляванне небанкаўскага фінансавага сектара.

Кіраўнік прадстаўніцтва ЕБРР у Беларусі таксама акцэнтаваў увагу на неабходнасці аптымізацыі чалавечага патэнцыялу: развіццё навыкаў і кваліфікацый у адпаведнасці з патрабаваннем рынку працы, стварэнне ўмоў для бесперапыннай адукацыі і павышэння кваліфікацыі, устойлівая гендарная палітыка ў галіне працаўладкавання — даванне роўных магчымасцяў у працаўладкаванні мужчынам і жанчынам, і развіццё сістэмы дзіцячых дашкольных установ.

Сам ЕБРР гатовы аказаць дапамогу ва ўкараненні эфектыўнага карпарацыйнага кіравання, у рэалізацыі функцыі ўласніка дзяржаўных прадпрыемстваў, падтрымцы падыходаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства і развіцці зялёнай эканомікі.

* * *

Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця — міжнародная арганізацыя, у якой Беларусь удзельнічае з пачатку 90-х гадоў. Першапачаткова банк быў створаны для падтрымкі трансфармацыі былых сацыялістычных краін, пазней набыў новых членаў і пашырыў рэгіёны аперацый. Цяпер працуе амаль у 40 краінах свету, мае капітал каля 30 мільярдаў еўра. На сённяшні дзень 2,3 мільярда еўра інвеставаў у Беларусь.

Сёлета ЕБРР заключыў у нашай краіне здзелкі на суму 240 мільёнаў еўра. Аднак 2018 год можа стаць рэкордным, калі адбудзецца падпісанне буйной здзелкі па інфраструктурным праекце — тады паказчык гадавых інвестыцый перавысіць 300 мільёнаў еўра.

Прыярытэты ЕБРР у Беларусі доўгі час уключалі развіццё выключна прыватнага сектара, галоўным чынам гэта захоўваецца і зараз. Але з 2016 года банк таксама актыўна працуе над павышэннем устойлівасці і якасці паслуг у дзяржаўнай інфраструктуры, над рэгулятыўнымі рэформамі, укараненнем камерцыйных рашэнняў на дзяржаўных прадпрыемствах. Арганізацыя працуе шляхам фінансавання праз банкі-партнёры і напрамую, уключаючы ў акцыянерны капітал, аказвае тэхдапамогу, вядзе дыялог і кансультацыі з урадам, праводзіць канферэнцыі, робіць эканамічныя агляды. Зараз ЕБРР працуе па новай працэдуры дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ЗЯМЛЯ ДЛЯ БІЗНЕСУ

У Беларусі вызначаны адзіныя, дакладныя і празрыстыя правілы давання і выкарыстання зямельных участкаў для вядзення бізнесу, паведаміў на парламенцкіх слуханнях старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Андрэй ГАЕЎ.

Рэзідэнты краіны могуць атрымаць зямлю ва ўласнасць або арэнду, замежныя арганізацыі — у арэнду на 99 гадоў. Канкрэтная інфармацыя пра тэрыторыі, падабраныя для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, размешчана ў свабодным доступе на сайтах мясцовых выканаўчых камітэтаў. Пры рэалізацыі інвестыцыйных дагавораў зямельныя ўчасткі даюцца без правядзення аўкцыёну і ўнясення платы за права заключэння дагавораў арэнды.

Інвестары таксама вызвалены ад кампенсацыі страт сельскагаспадарчай і лесагаспадарчай вытворчасці. Ёсць магчымасць растэрміноўкі ўнясення платы за права арэнды зямельных участкаў пры іх даванні для вытворчых будынкаў, аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, іншай нерухомасці без заключэння інвестыцыйных дагавораў. Грамадзянам дазваляецца выкарыстоўваць для рамесніцкай і прадпрымальніцкай дзейнасці, аказання паслуг у сферы аграгурызму зямельныя ўчасткі, дадзеныя ім для абслугоўвання жылых дамоў.

Спрошчана выдзяленне зямельных участкаў для прадпрымальніцтва ў сярэдніх, малых гарадах і сельскай мясцовасці.

Выкананне ўсяго комплексу паслуг па афармленні дакументаў, якія зацвярджаюць права на нерухомую маёмасць, сканцэнтравана ў сістэме аднаго дзяржаўнага органа — Дзяржкаммаёмасці. Падрыхтоўка для інвестара землеўпарадкавальных матэрыялаў адбываецца без яго ўдзелу па прынцыпе адной станцыі, ажыццяўляецца адначасова з выкананнем работ па будаўніцтве аб'екта. Кожнае чацвёртае рэгістрацыйнае дзеянне ў краіне адбываецца на працягу адной гадзіны.

Зараз на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта знаходзіцца праект дакумента, які прадугледжвае далейшае ўдасканаленне адносін па распараджэнні дзяржаўнай маёмасцю. Сярод асноўных навацый — павелічэнне перыяду растэрміноўкі аплаты маёмасці, якая набываецца (яе тэрмін будзе вызначаць пакупнік), магчымасць продажу на аўкцыёне нерухомасці, якая размешчана на ўсёй тэрыторыі краіны (акрамя абласных цэнтраў і Мінска) адразу за адну базавую велічыню пры выкарыстанні яе для прадпрымальніцкай дзейнасці. Праектам прапануецца ажыццяўляць продаж такой маёмасці на аўкцыёне адначасова як юрыдычным, так і фізічным асобам (цяпер спачатку на аўкцыён дапускаюцца толькі арганізацыі).

Сярод праблемных пытанняў у сферы распараджэння нерухомасцю Андрэй Гаеў назваў выпадкі, калі прадпрыемствы, якія жывуць за кошт здачы ў арэнду маёмасці, не развіваюць вытворчасць і не дазваляюць набыць яе добрасумленнаму арандатару. Сёння такія сітуацыі разглядаюцца на ўзроўні міжведамаснай групы, створанай урадам.

«Дзяржава цалкам гарантуе абарону зарэгістраваных правоў на набытую або пабудаваную нерухомую маёмасць», — запэўніў Андрэй Гаеў. Дарэчы, па паказчыку «рэгістрацыя ўласнасці» рэйтынга спрыяльнасці умоў вядзення бізнесу — 2019, які складае Сусветны банк, Беларусь займае пятае месца са 190 краін.

Што датычыцца прыватызацыі, то яна ў Беларусі носіць не масавы, а канкрэтны і кропкавы характар. Прыватызаваным можа быць любое прадпрыемства, пры захаванні наступных умоў: развіццё арганізацыі, захаванне працоўнага калектыву на пэўны тэрмін і справядлівая цана. «Дзеючае заканадаўства забяспечвае максімальную публічнасць прыватызацыі, замацаваны роўныя правы нацыянальных і замежных інвестараў на ўдзел у прыватызацыі дзяржмаёмасці», — падкрэсліў Андрэй Гаеў.

«Развіваецца і такі сучасны і празрысты спосаб прыватызацыі, як продаж акцый у гандлёвай сістэме Беларускай валютна-фондавай біржы, — паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. — Цяпер завяршаецца падрыхтоўка для продажу на біржы мінарытарных (да 25 %) пакетаў акцый Рэспублікі Беларусь васьмі акцыянерных таварыстваў».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ МАЛЕНЬКАЙ КАМПАНІІ

Як магілёўскія вучоныя ўкладвалі інвестыцыі ў сябе і што з гэтага атрымалася

МАГІЛЁЎСКАЯ інавацыйная фірма «ЭКОМП», якая спецыялізуецца на вытворчасці вырабаў тэхнічнага і медыцынскага прызначэння, была створана ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. А калі ўлічваць, што сваю дзейнасць заснавальнікі пачыналі яшчэ ў сярэдзіне 80-х, адзіным інвестарам на ўвесь вялікі Савецкі Саюз быў бюджэт. Найлепшыя выпускнікі Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута (цяпер Беларуска-Расійскі ўніверсітэт) выбралі сваёй прафесіяй навуку і, па сутнасці, зараблялі грошы для сваёй альма-матар, бо складалі касцяк навукова-даследчай лабараторыі валаконна-аптычнай тэхнікі, якая існавала пры ўстанове. Маладыя вучоныя прапаноўвалі не проста ідэі, а канкрэтныя распрацоўкі, якія былі запатрабаваныя ў ваеннаабароннай прамысловасці Савецкага Саюза. Але аднойчы ў краіне была аб'яўлена канверсія, і фінансаванне такіх вось невялічкіх навукова-даследчых лабараторый прыпынілася. Распрацоўшчыкі вымушаны былі выйсці ў адкрытае плаванне і паспрабаваць прадаць свой «інтэлект» як мага даражэй.

Аляксандр КАЦ дэманструе надгляднае абсталяванне.

Заказ для Хадаркоўскага

— Адна з першых структур, якая была фактычна створана Міхаілам Хадаркоўскім, «МЕНАТЭП»(міжгаліновыя навукова-тэхнічныя праграмы) прыцягвала маладых вучоных, канструктараў, каб з іх дапамогай вырашаць рэальныя патрэбы эканомікі, — расказвае **Аляксандр КАЦ, дырэктар ТАА «НВП ЭКОМП».** — У Савецкім Саюзе таварны рынак быў пусты, дрэнна было і ў прамысловасці, і ў ахове здароўя. Тады мы і звярнулі ўвагу на галіну медыцынскага абсталявання. Да гэтага рабілі для авіяцыі спецыяльныя бараскопы — такія тоненькія «вочкі», з дапамогай якіх можна было заглянуць у самую вузкую адтуліну. Але, як выкарыстаць на практыцы свой вопыт у грамадзянскай сферы, мы не ведалі. Пакуль не падвярнулася структура Хадаркоўскага. На той момант у медыцыне існавала патрэба ў лазерна-тэрапеўтычных установах. Мы іх стварылі.

Калі разваліўся Саюз, паўстала праблема з дзяржрэгістрацыяй нашай медыцынскай тэхнікі. Без гэтага нельга было яе прадаць — ніхто не купіць. Першыя некалькі вырабаў атрымалася зарэгістраваць толькі ў 1993 годзе. Тады ж паехалі на першую выстаўку ў Маскву і ўсе свае прыборы прадалі. А заадно знайшлі новых заказчыкаў і партнёраў.

На патрэбу дня

— Чым жыве сёння інавацыйная фірма? Хто ў яе інвестуе? Ці бярэ яна пазыкі?

— Мы самадастатковыя. Ніякіх пазыковых сродкаў не бяром, жывём выключна на сваё зароблена, — усміхаецца Аляксандр Кац. — Мы занялі сваю нішу і працуем выключна на заказы. Зараз, напрыклад, карыстаецца попытам надгляднае абсталяванне. Паколькі ва ўсім свеце існуе пагроза тэрору, шмат арганізацый, для якіх бяспека не пусты гук, набываюць гэтую прадукцыю. Робім простыя аптычныя даглядчыкі і больш прасунутыя — з электронікай і відэафіксацыяй. Дарэчы, пасля тэракта ў мінскім метро ў адным выданні пад фота чалавека з нашым надглядным абсталяваннем напісалі, што яно англійскае і вельмі дарагое. Я нават абуральны ліст выдаўцу накіраваў. Маўляў, крыўдзіце беларускага вытворцу. І яны далі абвяржэнне.

— Ваша прадукцыя з'яўляецца імпартазамяшчальнай?

— У Беларусі ёсць закон аб дзяржаўных закупках, і трэба прытрымлівацца пэўных працэдур. Акрамя нашых вырабаў у краіне зарэгістраваны расійскія, кітайскія, нямецкія... Нашы вырабы не горшыя за нямецкія і японскія, але нельга дырэктыўным шляхам прымусіць кагосьці браць толькі ў нас. Мы, напрыклад, пастаўляем нашы вырабы ў медыцынскія арганізацыі Беларусі. Але нам беларускага рынка вельмі мала. Той жа кальпаскоп намінальна павінен стаяць побач з кожным гінекалагічным крэслам. У 2003 годзе, напрыклад, па звестках Міністэрства аховы здароўя, патрэба ў іх была ў Беларусі прыблізна 440 штук. Гэта для нас усяго некалькі гадоў работы. А вось у Расіі маштабы большыя. Закупкі там таксама часткова цэнтралізаваныя, але нам пашчасціла знайсці добрых партнёраў.

— З якімі праблемамі даводзіцца сутыкацца?

— Складанасць у тым, што новыя медыцынскія вырабы нельга прапанаваць адразу ж, іх трэба спачатку зарэгістраваць. А працэдура рэгістрацыі расцягваецца на год-паўтара — тэхнічныя, клінічныя выпрабаванні, вялікая колькасць дакументаў. Гэта працэдура жорстка рэгламентуецца, яна складаная і дастаткова дарагая. Да таго ж раз у пяць гадоў рэгістрацыйнае пасведчанне трэба пацвярджаць. Апошнюю рэгістрацыю мы праходзілі ў 2016 годзе. І калі ў 2011 годзе ўвесь цыкл выпрабаванняў каштаваў нам 300 долараў, то ў 2016-м ужо каля 1500 долараў у эквіваленце. За пяць гадоў можаш столькі прыбытку не зарабіць, колькі ўкладзеш у распрацоўку, у гэтым праблема.

Дзе браць інвестыцыі?

— У Беларусі, здаецца, створаны ўсе ўмовы для інвестараў, але іх усё роўна не хапае. Як вы думаеце, чаму? — цікаўлюся ў суразмоўніка.

— У свеце асноўны спосаб прыцягнення інвестыцый — акцыі. Любая кампанія, якая хоча развівацца, не мае грошай, прапануе свае акцыі. Калі ў нас у краіне стваралі акцыянерныя таварыствы, ідэя была менавіта прыцягнуць грошы. У нашым разуменні, што нехта прыедзе і дасць нам грошы. Але так не бывае. Тыя ж кітайцы проста так грошы не даюць. Гэта або звязаны крэдыт — вось вам грошы, а на іх вы купіце ў нас тое і тое. Або, калі трэба нешта пабудаваць, яны таксама выкарыстоўваюць усё сваё. Любы донар зацікаўлены ў тым, каб зарабіць. Рынак акцый — барометр. У Беларусі з гэтым складана, бо якое прамысловае прадпрыемства ні вазьмі — манаполія. У гэтым, магчыма, ёсць свой сэнс. Бо так беларуская маёмасць можа перайсці ў чужыя рукі.

Летась на рахунках беларускіх грамадзян было 16 мільярдаў рублёў — вялікія інвестыцыі. Для банкаў гэта абаротныя сродкі, але вялікага прыросту эканомікі яны не даюць. У краіне створаны ўмовы для бізнесу, але не хапае стартавага капіталу. Каб тую ж кавярню адкрыць, трэба 300 тысяч долараў. А дзе іх узяць? Вы ж разумееце, стартапу акцыямі не выцягнуць, ён павінен скарыстацца пазыковымі сродкамі. Той жа крэдыт браць нявыгадна. Ужо ў наступным месяцы трэба пачынаць яго вяртаць. На наш маленькі рынак інвестары не спяшаюцца ісці. Ва ўсім свеце, дзе рыначная эканоміка не такая маладая, як у нас, грошы ўкладваюць у нешта даходнае.

— А ці ёсць краіне карысць ад такіх маленькіх фірмаў, як ваша?

— Маленькія фірмы добрыя тым, што ад заснавальнікаў патрабуюць мала выдаткаў, але прыносяць краіне вялікую карысць. У Беларусі ў 2016 годзе недзяржаўныя прадпрыемствы давалі ўклад у ВУП каля 30 %. У заходніх краінах працэнт наогул даходзіць да 60—65 %. Такімі фірмамі можна часткова вырашыць праблему недахопу інвестыцый. Яны не крэдытуюцца, не звяртаюцца да пазыковых сродкаў, але і не абцяжарваюць дзяржаву, плацяць падаткі і ствараюць рабочыя месцы. Маленькія фірмы закрываюць нішы, куды дзяржаве і буйным вытворцам ісці нявыгадна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ІНВЕСТЫЦЫІ ДЛЯ ІНАВАЦЫЙ, або Грошы для Таптунка

Вытворцы дзіцячага харчавання асвойваюць новыя віды імпартазамяшчальнай і канкурэнтаздольнай прадукцыі

Маларыцкі кансерваваагароднінасушыльны камбінат і задумваўся ў далёкія 50-я гады мінулага стагоддзя як прадпрыемства з інавацыйным відам вытворчасці. Тады ў самым паўднёвым горадзе Брэстчыны сталі выпускаць 1000 тон сушанай бульбы ў год. Заадно асвойвалі выпуск розных кансерваў і сокаў. І калі ў канцы 60-х гадоў маларытчане выпусцілі пробную партыю маркоўнага соку, гэта быў першы падобны прадукт у краіне. Менавіта за маркоўны сок яго вытворцы былі ўзнагароджаныя пераходным чырвоным сцягам ЦК КПСС, што засведчыла сапраўдную працоўную і тэхналагічную перамогу.

Галоўны тэхнолаг цяперашняга ААТ Валянціна ГРЫГАРУК гаворыць, што атрымаць натуральны сок з морквы і цяпер даволі складаны працэс. Куды лягчэй выціснуць сок з яблыка, слівы, ягады. Але ж прадпрыемства трымае марку. Тым больш што абсалютную большасць прадукцыі камбіната цяпер складае дзіцячае харчаванне. Больш за 130 відаў сокаў, нектараў, пюрэ пад гандлёвай маркай «Таптунок» становяцца пазнавальнымі не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Зафіксавана ўжо некалькі выпадкаў падробак. Яно і не дзіва.

Работніца Галіна ЧЭРНІК.

Маларыцкія дзіцячыя сокі і пюрэ ў 250-грамовых слоічках памятаюць мамы, якія ў 80—90-х гадах гадавалі дзяцей. З той пары вытворцы карыснай прадукцыі правялі некалькі этапаў мадэрнізацыі. Першыя маштабныя інвестыцыі былі ўкладзеныя ў рэканструкцыю ў 2005 годзе. Тады сушыльны цэх перавялі поўнасцю на новыя рэйкі. Сушаная бульба перастала быць актуальнай на рынку. А яе аграмадны цэх перапрафілявалі пад кансервы для дзіцячага харчавання. Паставілі найноўшае для таго часу абсталяванне, ўкаранілі перадавыя тэхналогіі.

— З той пары імкнёмся ісці ў нагу з часам, — расказвае **дырэктар прадпрыемства Юрый ВІТРУК.** — Апошняе прадугледжвае ўкладанне інвестыцый і стварэнне інавацыйных вытворчасцяў. Тры гады таму камбінат асвоіў выпуск дзіцячага харчавання ў сучаснай гнуткай упакоўцы з камбінаваных матэрыялаў. Гэтыя пакецікі з сімпатычным мядзведзікам на ўпакоўцы зручна браць у паездку альбо на вуліцу. На італьянскае абсталяванне для названай лініі затрачаны немалыя грошы. Канцэрн «Белдзяржхарчпрам» інвеставаў 23 працэнты сродкаў, 28 працэнтаў — Брэсцкі аблвыканкам, астатнія 49 працэнтаў склалі крэдыты.

Фінансавыя ўліванні сябе апраўдваюць. Да інавацыйнай маларыцкай смакаты, якая вырабляецца без кансервантаў, фарбавальнікаў, араматызатараў і нават без цукру, цікавасць праяўляюць не толькі беларускія спажыўцы. Прадукцыя ідзе на экспарт у Расію, пробныя партыя адпраўлены сёлета ў Казахстан, Кітай, Украіну.

Словам, цяпер мы маем прадпрыемства ў райцэнтры, якое паспяхова функцыянуе і развіваецца дзякуючы найперш інвестыцыям, укладзеным у мадэрнізацыю. Для Маларыты кансерваваагароднінасушыльны камбінат — горадаўтваральнае прадпрыемства, якое сёлета за 10 месяцаў зарабіла на экспарце тры з паловай мільёны долараў. Гэта таксама 200 работнікаў невялікага райцэнтра, якія, напрыклад, у кастрычніку мелі 946 рублёў сярэдняй зарплаты і поўны сацыяльны пакет.

На камбінаце карпатліва працуюць над пашырэннем рынкаў збыту. Маркетолагі прадпрымаюць новыя крокі па прасоўванні інавацыйнай прадукцыі. Так, напрыклад, да гнуткіх пакецікаў прыдумалі рознакаляровыя накрыўкі па адпаведнасці складу пюрэ. Да яблычных пюрэ ідуць зялёныя накрыўкі, да персікавых — аранжавыя, бананавых — жоўтыя, малінавых — чырвоныя. З гэтых накрывак можна складваць цацачныя кампазіцыі накшталт лега. І дзецям гэта падабаецца.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Маларыцкі раён.

НОВЫЯ ІМЁНЫ

Што паспеў зрабіць за сто дзён малады старшыня сельскага выканкама

НА СУБОТНІК — ПРАЗ ЗАКЛІК ВА «УКАНТАКЦЕ»

Мікалай ЛУГАЎСКОЙ прыйшоў у Ленінскі сельскі Савет Жабінкаўскага раёна з пасады другога сакратара абкама БРСМ сёлета ў ліпені. Як і варта было чакаць, за справу ўзяўся з маладым запалам. І за тры месяцы работы паспеў рэалізаваць некалькі ўласных ініцыятыў.

Старшыня сельскага Савета Мікалай ЛУГАЎСКОЙ падчас пасадкі алеі.

ДОШКА ПАШАНЫ І НОВЫ СКВЕР

Каля ўвахода ў сельскі Савет маю ўвагу прыцягнула Дошка пашаны. Такія даводзілася бачыць у вёсках, але на іх заўсёды красаваліся здымкі перадавікоў сельгаспрадпрыемства. А тут побач з работнікамі і спецыялістамі сельскага ААТ размешчаны партрэты настаўніка, фельчара, прадпрымальніка, бібліятэкара. На Дошку пашаны Ленінскага сельсавета занесены імёны найлепшых працаўнікоў прадпрыемстваў, устаноў розных формаў гаспадарання, якія ёсць на тэрыторыі. Як паказваюць першыя водгукі, людзі ацанілі такую ўвагу.

Вядома, самай галоўнай справай мясцовай улады заўсёды было добраўпарадкаванне. Восеньскія клопаты па навядзенні парадку сёлета пачалі з закладкі новага сквера, а калі пасадзілі маленькія дрэўцы і абазначылі будучае месца адпачынку, вырашылі работу па азеляненні працягнуць. Лясгас выдзеліў саджанцы елкі: 179 маленькіх дрэўцаў пасадзілі ўздоўж дарогі (пасёлак стаіць на трасе М1).

— Паглядзелі з іншых вуліц, а таксама жыхары Рагозна, Філіпавіч, Буснёў на добрую справу, захацелі ў сябе пасадзіць дрэўцы, — расказвае Мікалай Лугаўской. — Сельсавет іх падтрымаў. Людзі выйшлі на суботнікі, папрацавалі грамадой, разам будуць і даглядаць маладыя елачкі.

І калі з гэтай работай жыхары справіліся самі, то з іншымі аб'ектамі, якія патрабуюць добраўпарадкавання, сітуацыя больш складаная. Напрыклад, у старадаўнім парку, што ўяўляе сабой рэшткі былой панскай сядзібы, таксама правялі суботнік. Прыбралі сухія галіны, апалае лісце. Але там патрэбны грошы, каб, напрыклад, мець магчымасць пачысціць былыя сажалкі, пракласці дарожкі, пасадзіць новыя дрэвы. Кіраўніку мясцовай улады падказалі, што можна падрыхтаваць дакументы і прыняць удзел у конкурсе ініцыятыў, вынік якога — атрыманне гранта на добрую справу. Так што цяпер рыхтуецца апісанне будучай экалагічнай сцяжыны.

ПАРАДАК КАЛЯ ПОМНІКАЎ

Грунтоўная работа ў апошнія месяцы праведзеная па рамонце і добраўпарадкаванні тэрыторыі вакол капліцы ў гонар Крупчыцкай бітвы. Самая вялікая і крывавая бітва падчас касцюшкаўскага паўстання адбылася ў верасні 1794 года пад Крупчыцамі, цяпер гэта вёска Чыжэўшчына. На гэтым месцы стаіць капліца, якую трэба перыядычна даглядаць і абнаўляць. Таму старшыня мясцовай улады не абмежаваўся адным суботнікам. Быў арганізаваны сапраўдны працоўны дэсант. Спачатку падправілі фундамент, пафарбавалі агароджу, прыбралі шмат непатрэбных раслін. Карацей, надалі тэрыторыі прывабны выгляд. Таксама дагледжзелі помнік ахвярам Халакосту, які ўстаноўлены ў вёсцы Хадасы.

— Утрымліваць помнікі дастойна на сваёй тэрыторыі заўсёды лічылася справай гонару нашчадкаў, — кажа старшыня сельскага Савета.

Анатоль ШАЛТАНЮК, старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў:

— Ленінскі сельсавет асаблівы. Яго цэнтр — аграгарадок Ленінскі — і навакольныя вёскі размешчаны ў бойкім месцы, паабапал трасы М1. Тут вельмі зручна дабірацца да Брэста, Кобрына. Некаторыя і працуюць у гэтых гарадах. Дзве траціны насельніцтва Ленінскага складаюць людзі да 40 гадоў. У пасёлку і навакольных вёсках няма ніводнага вольнага ўчастка пад забудову, яны тут жа разбіраюцца. Тут не засталося і свабоднага гектара зямлі, бо развіты падсобныя гаспадаркі, ёсць фермеры. Аграгарадок мае добрую інфраструктуру, свае традыцыі, захавальнікамі якіх з'яўляюцца школа і культурныя ўстановы. У гэтых умовах падтрымліваць парадак надзвычай актуальна. Лічу, што новы кіраўнік сельвыканкама нездарма зрабіў упор на згуртаванне людзей вакол добрых спраў і выкарыстоўвае для гэтага ў тым ліку інфармацыйныя тэхналогіі. А для тых, хто з інтэрнэтам не вельмі сяброўе, каля сельскага Савета з'явіўся новы інфармацыйны стэнд.

СТАНОЎЧЫ ПРЫКЛАД

Мікалай Лугаўской мае намер акцэнтаваць увагу на станоўчым прыкладзе, усяляк падтрымліваць вопыт жыхароў, якія ствараюць прыгажосць вакол сябе. Так з'явілася рашэнне праводзіць конкурс на найлепшы падворак не раз, а два разы на год: вясной і восенню. Сёлета такі конкурс праводзілі ў жніўні. На ім у ліку іншых быў адзначаны Міхаіл Хандрыка, які працуе культарганізатарам у санаторыі «Надзея». Гаспадар і яго жонка добраўпарадкавалі спачатку ўласны падворак, затым навялі прыгажосць на вуліцы побач з домам: пасеялі газонную траву, разбілі клумбы, зрабілі падсветку. І цяпер іх сядзіба — адна з найпрыгажэйшых у Ленінскім.

А зрабіць свята вёскі святам для ўсіх можна, калі згуртаваць аднадумцаў, знайсці падтрымку ў грамады — да такой высновы прыйшоў старшыня падчас першага ў сваёй практыцы вясковага свята. І калі знайсці грошы на прэміі пераможцам конкурсаў аказалася няпроста, то арганізаваць захвочвальныя прызы ўдалося. Мясцовая прадпрымальніца-цырульнік ахвяравала некалькі сертыфікатаў для наведвання сваёй майстэрні, прадпрымальнікі-аграрыі ўзнагароджвалі ўласнай прадукцыяй.

Кіраўнік ААТ «Рагазнянскае» Аляксандр Семянюк кажа, што заўсёды гатовы падтрымаць разумную ініцыятыву. Так было, дарэчы, і з Дошкай пашаны, выраб якой прафінансавала гаспадарка. Ну і ў справе добраўпарадкавання сельгаспрадпрыемства ніколі не застаецца ўбаку. Тут жа жыве значная частка працаўнікоў і ветэранаў гаспадаркі. Папрасіў аднойчы выканкам прывезці чарназёму для ўладкавання двара побач з адным з самых старых шматкватэрных дамоў. Грунт падвезлі машынай гаспадаркі. Людзі выйшлі на вуліцу дружна, зямлю разраўнялі, пасадзілі туі, кветкі. У ЖКГ убачылі, што ў доме жывуць руплівыя гаспадары, і праклалі каля дома новыя дарожкі. Пайшла ланцуговая рэакцыя добрых спраў.

Да наступнага свята вёскі рыхтуецца мноства іншых спраў і пачынанняў. Напрыклад, каваль Аляксандр Кузнец у якасці падарунка Ленінскаму ўзяўся выкаваць ажурны слуп з указальнікам населеных пунктаў і сацыяльна-значных аб'ектаў. Ёсць іншыя падобныя задумкі.

Таму Мікалай Лугаўской актыўна прысутнічае ў сацыяльных сетках, ёсць сельсавецкія групы ва «УКантакце», «Фэйсбуку» і «Твітэры». На любую добрую справу людзей можна арганізаваць, папярэдне кінуўшы заклік. У найбліжэйшыя дні старшыня плануе звярнуцца да землякоў з прапановай арганізаваць у пасёлку навагоднюю елку. Раней тут святочны атрыбут ніколі не ставілі, а пасля дванаццаці ў навагоднюю ноч людзі збіраліся каля Дома культуры на вясковае народнае гулянне. Але ж без сімвалічнага дрэўца, згадзіцеся, не той каларыт Новага года. Выправіць справу можна талакой: ад кожнай сям'і дастаткова прынесці па два шары і ўпакоўку мішуры. Прадпрымальнікі згадзіліся дапамагчы электрычнымі гірляндамі. Калі людзі ідэю падтрымаюць, гэтым разам будзе прыгожая навагодняя елка ў Ленінскім.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Жабінкаўскі раён.

ДОСВЕД У НЮАНСАХ

Якім чынам ствараць новыя працоўныя месцы на вёсцы? Як арганізаваць работу па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі? За якія сродкі выдаляюцца дрэвы на вясковых могілках? Гэтыя і іншыя праблемныя пытанні абмяркоўваліся ў Ельскім раёне падчас абласнога семінара са старшынямі раённых Саветаў дэпутатаў Гомельшчыны.

Выязная сустрэча дэпутатаў і кіраўнікоў абласных арганізацый далёка не першая, таму дыялог ідзе актыўны. Дасягненні і недахопы ў пэўных сельскіх населеных пунктах бачны адразу. У Млыноцкім сельсавеце, напрыклад, завязалася вострая дыскусія, звязаная з арганізацыяй парадку на могілках. Ёсць пытанні з пляцоўкамі для смецця і пахаваннямі нябожчыкаў, людзі ажыццяўляюць пахаванні ў магілы сваіх продкаў без дазволу сельсавета. **Алена КОЗІНЦАВА, старшыня сельвыканкама,** адзначае, што сёлета жук-караед дабраўся да могілак — хвоі адразу сталі жоўтыя. А гэта значыць, што векавыя дрэвы, якія там растуць, патрабуюць тэрміновага выдалення.

Праблемы, звязаныя з гэтым працэсам, добра вядомыя ўсім старшыням раённых Саветаў і сельвыканкамаў. Для правядзення работ запрашаюць спецыялістаў МНС і камунальныя службы з адпаведнай тэхнікай. Але ж вялізныя машыны часцей за ўсё працуюць па перыметры. Усярэдзіне патрабуецца амаль ювелірная работа, каб пры падзенні галін не пашкодзіць помнікі. У Млыноцкім сельсавеце са сваіх жыхароў знайшлі мужчыну, які згадзіўся атрымаць новую кваліфікацыю і адправілі яго вучыцца на прамысловага альпініста. Цяпер ён займаецца карпатлівай работай па выдаленні старых дрэў, у тым ліку на могілках.

«За якія сродкі выдаляюцца дрэвы?» Гэтае пытанне дэпутаты задаюць адзін аднаму і тут жа дзеляцца досведам. За сродкі на добраўпарадкаванне і так званае самаабкладанне. Раённымі ўладамі выдзяляюцца грошы на добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў і помнікаў, якія маюць статус гісторыка-культурнай спадчыны. У Ельскім раёне, напрыклад, налета два сельскія Саветы паўдзельнічаюць у праграме па рэстаўрацыі воінскіх пахаванняў. Таксама тут актыўна працуюць з мясцовым упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Беспрацоўных людзей з адпаведнай кваліфікацыяй актыўна прыцягваюць да работ на могілках.

— Першачарговая задача дэпутатаў і старшыняў камісій па садзейнічанні занятасці, — кажа **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ,** — данесці ў даступнай форме гэтую інфармацыю да кожнага жыхара свайго рэгіёна. Дарэчы, мы прыступаем да фарміравання плана на наступны год, у якім працягнем абмен інавацыйным досведам па розных кірунках нашай дзейнасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

Замест кантэйнераў — машыны «адказных таварышаў»

У Гаранскім сельсавеце прыём грамадзян па асабістых пытаннях правяла старшыня Мінскага раённага Савета дэпутатаў Юлія БЯЛЯНКІНА. Спектр праблем, якія хвалююць людзей, дастаткова шырокі, паведамляе газета Мінскага раёна «Прысталічча».

Напрыклад, бацька шматдзетнай сям'і, у якой да таго ж выхоўваецца і дзіця-інвалід, Сяргей Лагвіненка, прасіў растлумачыць, ці мае ён права выкупіць дом, дзе жыве яго сям'я, на льготных умовах? Заяўніку дадзены адпаведныя рэкамендацыі.

Пенсіянер Аляксандр Ключнік з пасёлка Траскоўшчына турбаваўся наконт рамонту дарогі на вуліцы Школьнай. Паводле яго слоў, там толькі трэба падсыпаць друзам 50 метраў дарожнага палатна.

Зрэшты, на нездавальняючы стан мясцовых дарог скардзіліся і іншыя грамадзяне, якія прыйшлі на прыём. Неабходныя тлумачэнні з гэтай нагоды даў дырэктар ДРБУ-194 Віктар Рагускі, які прысутнічаў на прыёме.

Аляксей Жэшка і Алена Асіпенка хадайнічалі аб уключэнні інжынерных сетак жылой забудовы аграгарадка Наваселле ў план будаўніцтва, які фінансуецца з бюджэту Мінскага раёна. Ім варта паспяшацца: заявы на разгляд дадзенага пытання прымаюцца не пазней за сярэдзіну снежня гэтага года.

З 2014-га вядуць перапіску з чыноўнікамі жыхары дома № 6 на вуліцы Маладзёжнай у Наваселлі, паведаміла Ларыса Крыловіч, якая прыйшла на прыём. Людзі просяць аб адным: завяршыць рамонт даху іх дома, які так да гэтага часу і не скончаны. Між тым дом заліваюць дажджы. Па тэлефоне **дырэктар Жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міншчыны Арцём ЯФРЭМАЎ** растлумачыў, што рамонт будзе завершаны ў пачатку наступнага года. Што і казаць, камунальнікі застаюцца верныя сабе: шчодра раздаюць абяцанні, пра якія потым забываюцца. Паглядзім, ці стрымаюць яны слова гэтым разам.

Ларыса Крыловіч таксама ўзняла пытанне выкарыстання пяці кантэйнераў для збору камунальных адходаў. Яны выстаўлены каля яе агарода непасрэдна на зямлі, нягледзячы на тое, што побач знаходзіцца асфальтавая пляцоўка, аднак на ёй ставяць свае асабістыя машыны розныя «адказныя таварышы». Пытанне ўзята на кантроль.

А жыхара вёскі Крылава Канстанціна Вяжэвіча турбуе блытаніна ў нумарацыі дамоў раёна жылой забудовы. Гэта стварае пэўныя нязручнасці для пад'езду машын экстранных службаў: хуткай дапамогі, пажарнай, міліцыі. Навесці парадак у нумарацыі дамоў можна толькі пры ўмове, калі кожны з іх уладальнікаў звернецца ў адпаведную рэспубліканскую ўстанову.

КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

Экалагічная адукацыя, змена спажывецкіх звычак і сартаванне адходаў ці забароны і абмежаванні на вытворчасць непрыдатнай для перапрацоўкі прадукцыі, стварэнне новых тавараў, якія могуць вырабляцца з другасных рэсурсаў, і выкарыстанне смецця як паліва. Беларусі яшчэ давядзецца выбіраць свой шлях да жыцця без адходаў...

У найбліжэйшы час мы можам застацца без аднаразовага посуду, саломінак для кактэйляў і ватных палачак. Ва ўсялякім разе, у хуткім часе яны знікнуць у Еўрасаюзе. І гэта толькі адзін з крокаў па барацьбе з пластыкам.

За апошнія пяцьдзясят гадоў ужыванне пластыку ў Еўропе павялічылася ў 20 разоў. Сінтэтычныя палімеры, танныя і зручныя для спажыўцоў, замянілі паперу, дрэва, шкло. Пры гэтым значна сталі прырастаць звалкі, пераважна дзякуючы аднаразовай упакоўцы. І калі Еўропа пачала тануць у смецці, якое аказалася складана, а то і немагчыма перапрацаваць, эколагі забілі трывогу. У адказ на іх выступленні ў Еўрасаюзе былі прыняты адпаведныя заканадаўчыя акты і распрацавана цэлая стратэгія па абыходжанні з адходамі. Натуральна, адна з асноўных задач, якую трэба вырашаць сёння, — скарачэнне вытворчасці пластыку, які не можа быць перапрацаваны.

Зразумела, Беларусь не зможа застацца ўбаку і нам давядзецца таксама вырашаць «пластыкавую праблему». Напэўна, нашым вытворцам ужо цяпер варта падумаць пра альтэрнатыву сінтэтычным палімерам. А спажыўцам пачаць прызвычайвацца абыходзіцца хаця б без таго ж аднаразовага посуду і поліэтыленавых пакетаў.

Шмат намаганняў да барацьбы з адходамі прыкладаюць беларускія экалагічныя арганізацыі. Часам іх праекты, якія пачыналіся як валанцёрская справа, перарастаюць у экалагічны бізнес. Пры гэтым яны спрабуюць адвучыць беларусаў ад дрэнных, «экалагічна недружалюбных» звычак.

Сацыялагічнае апытанне, праведзенае Цэнтрам экалагічных рашэнняў, паказала, што 55 працэнтаў беларусаў маюць у сваёй шафе адзенне, якое надзявалася ўсяго пару разоў. Але незапатрабаваным рэчам можна знайсці прымяненне. Так, дабрачынны магазін «Калі ласка» прымае непатрэбнае адзенне і перадае людзям, якія трапілі ў складанае матэрыяльнае становішча.

Сацыялагічнае апытанне таксама засведчыла, што 39 працэнтаў жыхароў краіны выкідаюць рэшткі ежы. І гэта эканомныя беларусы! Ужо з'явілася ініцыятыва «Мінскі кошык», якая працуе з гэтай праблемай. Актывісты прыдумалі, што рабіць з рэшткамі ежы, пратэрміна-ванымі прадуктамі і таварамі супермаркетаў, тэрмін прыдатнасці якіх хутка скончыцца.

Актывісты паклапаціліся і пра тое, як абараніць спажыўца ад лішніх пакупак. Напрыклад, каб павесіць карціну, зусім не абавязкова набываць дрыль, яе можна ўзяць у бібліятэцы інструментаў.

Хутка знайшлася альтэрнатыва поліэтыленавым пакетам. Так, сёння можна не толькі набыць тканінавыя торбы і спецыяльныя шматразовыя фасовачныя пакецікі, але і самім навучыцца іх шыць (праект «ТорбаШоу»).

Усе вышэй згаданыя ініцыятывы скіраваныя на тое, каб мяняць паводзіны спажыўца, адвучаць яго ад тавараў, якія потым запаўняюць нашы сметніцы. Але ці многія людзі адразу змогуць пераключыцца на экалагічна дружалюбны лад жыцця?

Пакуль гаварыць пра татальную «экасвядомасць» насельніцтва не даводзіцца. Нават прывучыць людзей збіраць адходы асобна аказалася не так проста. Многія яшчэ не даносяць другасныя рэсурсы да каляровых кантэйнераў. Некаторыя пры гэтым заяўляюць: «Навошта сартаваць, калі ўсё смецце забірае адна машына?» Насамрэч змесціва каляровых кантэйнераў пасля трапляе на сартавальныя пункты, і ад 20 да 80 працэнтаў яго ідзе на перапрацоўку. З агульных жа кантэйнераў можна пусціць у справу не больш за 10 працэнтаў адходаў.

ШТО РАБІЦЬ?

Шмат намаганняў, накіраваных на перавтварэнне адходаў у другасныя рэсурсы, робіцца дзяржорганамі. Пытанне, прысвечанае гэтай тэме, будзе разглядацца на парламенцкіх слуханнях у наступным годзе. Але сёння варта задумацца і над тым, што рабіць, каб звычайныя жыхары маглі дапамагаць у вырашэнні «смеццевых» пытанняў, якіх, на жаль, менш не становіцца. Як змагацца з несанкцыянаванымі звалкамі? Што перашкаджае людзям сартаваць адходы? Як паўплываць на вытворцаў, якія вырабляюць тавар, непрыдатны для перапрацоўкі? Каму і як перашкаджае смецце? І якія шляхі для вырашэння такіх праблем бачаць нашы чытачы? «МС» усіх запрашае да дыскусіі.

Дасылайце свае меркаванні ў рэдакцыю на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск з пометкай «для «МС». Ці на электронны адрас: info@zviazda.by.

А яшчэ мы прапануем чытачам прыняць удзел у нашай экалагічнай апытанцы на сайце zviazda.by. Кожны тыдзень мы будзем падводзіць яе вынікі і змяняць пытанні, каб даведацца, наколькі «экасвядомыя» нашы чытачы.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Ці хвалюе вас праблема бытавога смецця?

- Так.
- Не.
- Не задумваўся аб гэтым.

Што для вас найбольш значнае ў вырашэнні праблемы ўтылізацыі смецця?

- Забруджванне планеты.
- Чысціня ў двары / у горадзе.
- Яшчэ адна магчымасць зарабіць грошы.

Што неабходна зрабіць для таго, каб паўсюдна ўвесці раздзельны збор смецця?

- Павышаць агульную культуру людзей, тлумачыць, для чаго гэта трэба.
- Павялічыць колькасць дворнікаў.
- Ставіць больш спецыяльных кантэйнераў.
- Быць патрабавальнымі да сябе і членаў сям'і.

У якім населеным пункце вы жывяце?

- Мегаполіс (сталіца, абласны горад).
- Невялікі раённы горад.
- Пасёлак, аграгарадок, вёска.

Ваш узрост

- 15—20 гадоў.
- 20—30 гадоў.
- 30—45 гадоў.
- 45—60 гадоў.
- 60+.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 22 лістапада 2018 года.**